Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Горкому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 36 (3940)
СУБОТА, 7 ЛЮТАГА 1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Па-бальшавіцку выканаць фінансавыя задачы першага кварталу

Апошнія дырэктывы партыі выразна падкрэсьлілі тое вялізарнейшае значэньне, якое на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва маюць пытаньні фінансавага пляну.

Строгае выкананьне фінансавага пляну зьяўляецца важнейшай умовай выкананьня ўсёй праграмы народна-гаспадарчага пляну.

Задачы, якія пастаўлены фінансавым плянам на 1931 год, труднасьці, якія стаяць на шляху яго вырашэньня, патрабуюць, каб не фармальна, а на справе выконвалася дырэктыва партыі аб рашучай барацьбе з надаўценнай ролі фінансавай сыстэмы і значэньня фінансавай работы. Тэмпы работы фінансавага апарату павінны поўнасьцю адпавядаць агульным тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва. Павінна быць значна ўзмоцнена ўвага фінансавым пытаньням з боку партарганізацыі і саветаў.

Выключна важнае значэньне мае фінансавая работа ў раёне, які зьяўляецца асноўным звяном сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы. Першы квартал фінансавага пляну мае асабліва адказныя задачы таму, што ён вырашае праблему накапленьня рэзэрву для фінансаваньня капітальнага будаўніцтва, веснавой пасяўной кампаніі і ўсёй праграмы сацыялістычнага будаўніцтва 1931 году. Фінансаваньне гэтае праграмы павінна быць ажыцьцёўлена ў бягучым годзе ня толькі без скарыстаньня эмісіі, але з утварэньнем рэзэрву, запрактаванага па Саюзе ў суме 1,5 мрд. рублёў.

Мінуўшы першы месяц трэцяга году пяцігодкі гаворыць аб тым, што яшчэ ня ўсе раённыя партарганізацыі і райвыканкомы належным чынам ацанілі значэньне фінансавай работы і важнасьць пастаўленых у галіне фінансавага пляну задач. Аб гэтым сьведчаць вынікі выкананьня ў студзені адкрэй з адказьнейшых частак фінансавага пляну—пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Пры гадавым плане ў суме плян 150 мільёнаў рублёў і пляне на першы квартал у 43,8 мільёнаў руб. ЗА СТУДЗЕНЬ САБРАНА ТОЛЬКІ 7 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ. Зь $^1/_{16}$ частку году выканана менш $^1/_{20}$ часткі гадавога ПЛЯНУ, А ПЛЯН ПЕРШАГА КВАРТАЛУ ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 16 ПРОЦ. Вынікі студзеня па шмат якіх раёнах больш характарызуюць інакш, як зрыў плянавага заданьня (Валынецкі раён—18,1 проц., Лоеўскі—18,8 проц., Чэрэйскі—21,7 проц., Крычаўскі—23,2 проц., Быхаўскі—24,6 проц. месячнага пляну).

Недавыкананьне пляну вызначаецца па асноўных вучастках, прычым, асабліва значнае недавыкананьне ёсьць па пляцях у ВЁСЦЯХ. Заданьне па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» ў вёсцы выканана на 1 лютага толькі на 42,4 проц. пляну. План звароту сельска-гаспадарчых пазык выкананы на 49,9 проц.; павышэньне ўзносы спажывецкімі таварыствамі сабраны ў разьмеры 47,2 проц. месячнага пляну; рэалізацыя акцый Трактарацэнтру, якая мае буйнейшае значэньне ў сэнсе забесьпячэньня БССР трактарамі, зусім не разгарнулася і за месяц выкананэ толькі на 4,5 проц. пляну.

Недапушчальнае выкананьне дырэктыў адзначаецца ў справе правядзеньня фінансавых мерапрыемстваў у адносінах да кулацтва. Не ва ўсіх раёнах кулакі поўнасьцю выяўлены; за абкладзенымі кулакамі лічацца значныя сумы абавязковых плацяжоў; ні адзін раён ня выканаў дырэктывы аб поўным спагнаньні з кулакоў да 1 лютага адназовага збору. Тут мы маем у асобных раёнах праявы махровай апартуністычнай практыкі.

У асобным квартале, асабліва ў канцы кварталу, быў дасягнут поўны дадатны пералом у сэнсе ўзмацненьня мабілізацыі сродкаў. Аднак, замест замацаваньня ўздыму асобнага кварталу, замест бальшавіцкай настойлівасьці і далейшага нарастаньня тэмпаў з боку раду раённых партарганізацый і райвыканкомаў было дапушчана рэзкае паслабленьне работы фінансавага апарату.

Дырэктыва ЦК аб стварэньні пастаянных штабаў кіраўніцтва справай мабілізацыі сродкаў некатэрымі раёнамі ня выканана (Чырвонаслабодзкі, Лёзьненскі), а ў радзе раёнаў арганізаваныя штабы не ажыцьцяўляюць патрэбнага кіраўніцтва справай мабілізацыі сродкаў.

Раённыя фінорганы ня ўзялі баявых тэмпаў работы. Гомельскі, напрыклад, райфа толькі 26 студзеня паставіў на пасяджэньні прэзыдыуму райвыканкому плян на першы квартал, прычым гэта пытаньне, з-за непадрыхтаванасьці нават не разглядалася. У выніку працаваўшы цэлы месяц бяз пляну раён выканаў яго толькі на 22 проц.

Па радзе раёнаў, ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы аб узмацненьні фінансавага апарату і недапушчальнасьці адрыву фінансавых работнікаў ад іх непасраднае работы, нагледзацца няўважлівыя адносіны да ўкамплектаваньня штату фінорганаў, а іншы раз і простая дэзарганізацыя фінансавага апарату (перавод на іншую работу і г. д.).

Такім адносінам да пытаньняў выкананьня фінансавага пляну неабходна рашуча і безадкладна пакласьці канец.

ЛЮТЫ—РАШАЮЧЫ МЕСЯЦ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ.

За гэты месяц павінна быць сабрана больш 23 мільёнаў рублёў. Адна дэкада лютага павінна даць больш, чым увесь студзень месяц. Работу па мабілізацыі сродкаў неабходна неадкладна перавесьці на баявыя тэмпы.

План мабілізацыі сродкаў першага кварталу грунтуецца, галоўным чынам, на добраахвотных плацяжох. Гэта патрабуе самай шырокай мабілізацыі калгасьнікаў, бядняцка-сярэдняцкіх мас вёскі вакол пытаньня выкананьня фінансавага пляну. Павінна быць паведзена рашучая барацьба з усякімі выпадкамі падмены арганізацыйна-масавай работы сярод бядняцка-сярэдняцкіх мас мэтадамі голага адміністраваньня.

Рашэючымі пытаньнямі лютаўскага пляну зьяўляюцца—выкананьне заданьня па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады», асабліва на вёсцы. Пытаньне гэта павінна стаяць у цэнтры работы раённых партарганізацый і райвыканкомаў у галіне мабілізацыі сродкаў. Неабходна дабіцца рашучага паляпшэньня работы ашчадкас і ўзмацненьня прыліву ўкладаў.

Вялізарнейшае значэньне мае выкананьне ў лютым месяцы АДНАРАЗОВАГА ЗБОРУ. Весткі з месц сьведчаць аб тым, што бядняцка-сярэдняцкія масы зусім сьвядома сустрэлі гэта новае фінансава-палітычнае мерапрыемства. Рад вёсак ужо пачаў поўнасьцю ўплочваць збор. Неабходна шырока скарыстаць энтузіязм мільённых бядняцка-сярэдняцкіх мас вёскі, мабілізаваць іх на выкананьне балавых задач фінансавага пляну.

Разам з гэтым неабходна дабіцца рашучага ўзмацненьня работы ў справе паступленьня с-г. падычак і павышэньня ўзносаў у розныя віды страхаваньня.

Выкананьне фінансавага пляну стаіць у цэснай залежнасьці ад выкананьня ўсіх ЯКАСНЫХ і КОЛЬКАСНЫХ паказальнікаў ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі. Барацьба за якасныя паказальнікі, за накапленьне ў агрэгаваным сэктары, за выкананьне праграмы адлічэньняў ад даходаў агрэгаванага сэктару ў фінансавую сыстэму належным чынам яшчэ не разгорнута. ЖОРСТКАЯ ФІНАНСАВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА, СТРОГІ АПЭРАЦЫЙНЫ КАНТРОЛЬ ЗА ВЫКАНАНЬНЕМ ФІНАНСАВЫХ ПЛЯНАЎ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА НЕАБХОДНАЙ УМОВАЙ ВЫРАШЭНЬНЯ ФІНАНСАВЫХ ЗАДАЧ УСЯГО ГОДУ І ПЕРШАГА КВАРТАЛУ Ў ПРЫВАТНАСЬЦІ.

Праца па мабілізацыі сродкаў павінна быць цесна ўвязана з усімі гаспадарча-палітычнымі кампаніямі ў вёсцы (загатоўкі, пасеўная і г. д.).

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу мае надзвычай сур'ёзнае гаспадарча-палітычнае значэньне. ПЛЯН НАШ РЭАЛЬНЫ. ЁН МОЖА І ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН.

Безадкладная і рашучая ліквідацыя дэмабілізацыйных настроеў у фінансава-крэдытным апараце, выразнае правядзеньне клясавай лініі ва ўсёй фінансавай рабоце, стапае, не фармальнае, а сапраўды бальшавіцкае кіраўніцтва справай мабілізацыі сродкаў з боку партарганізацый, бязьлітаснае змаганьне з правымі і «левымі» апартуністамі і апартуністычнай практыкай—асноўныя ўмовы посьпеху выкананьня фінансавага пляну.

Давыбары акадэмікаў

Ператварыць БАН у сапраўдную зброю партыі!

Каго вылучае таварыства гісторыкаў-марксыстаў?

1-га лютага адбыўся сход таварыства гісторыкаў-марксыстаў, на якім быў заслуханы даклад тав. Рыўліна аб рабоце Беларускай Акадэміі Навук і абгавораны кандыдатуры, што вылучаюцца таварыствам пры давыбарах у члены БАН.

Заслухаўшы даклад тав. Рыўліна, агульны сход ухваліў:

1. Канстатаваць, што ў складзе БАН да пядаўняга часу была значная група контр-рэвалюцыйных акадэмікаў, ня маючых жаднай вартасьці ў навуковым сэнсе, якая выкарыстоўвала, пад прыкрыцьцем нацыянал-апартуністычнага кіраўніцтва, БАН і яго катэдры і інстытуты для сваёй контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці.

2. Лічыць патрэбным весьці давыбары БАН пад знакам ператварэньня яе ў сапраўдную зброю партыі і савецкай улады, у сапраўдны цэнтр савецкай навукі на Беларусі, у вышэйшую марксыстка-ленінскую навукова-дасьледчую ўстанову.

Выходзячы з гэтага, а таксама ўлічваючы асаблівую важнасьць гістарычнага вучастку навуковага фронту, агульны сход таварыства гісторыкаў-марксыстаў высоўвае ў члены БАН наступных т. т. членаў праўленьня т-ва:

1. Сэрбэнта В. — (гісторыя і ленінізм).
2. Рыўлін Е. — (гісторыя Захаду).
3. Шчарбакоў — (гісторыя).

Кіруючых ударнікаў марксыстка-ленінскага навуковага фронту—у члены БАН

Таварыства ваўпічных матар'ялістаў-дыялектыкаў адзначае, што Беларуская Акадэмія Навук да гэтага часу, ня толькі ня выканала тых задач, якія ўскладаліся на яе партыяй, уладай і савецкай грамадзкасьцю, але была плацдармам, базай контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму.

Агульны сход членаў таварыства лічыць, што давыбары павінны праходзіць пад знакам ператварэньня БАН у аўтарытэтнейшую марксыстка-ленінскую навуковую ўстанову, што непаўна зьяўляе сваю тэарытычную работу з практычнымі задачамі партыі і савецкай улады.

Таварыства ваўпічных матэрыялістаў-дыялектыкаў лічыць неабходным вылучэньне ў члены БАН кіруючых ударнікаў марксыстка-ленінскага навуковага фронту БССР і са свайго боку прапануе наступныя кандыдатуры:

1. Панкевіч — член праўленьня асацыяцыі марксыцкіх навуковых таварыстваў, старшыня таварыства пэдагогаў-марксыстаў, дырэктар інстытуту пэдагогікі. (Пэдагогіка).
2. Бурстын — прафэсар, член таварыства ваўпічных матэрыялістаў-дыялектыкаў (матэматыка).
3. Сэрбэнта — член праўленьня асацыяцыі марксыцкіх навуковых таварыстваў, старшыня таварыства гісторыкаў-марксыстаў, дырэктар інстытуту імя Леніна і рэдактар беларускага выданьня твораў Леніна (гісторыя).
4. Рыўлін — член праўленьня, асацыяцыі марксыцкіх навуковых таварыстваў і праўленьня т-ва гісторыкаў-марксыстаў, член прэзыдыуму БАН і дырэктар інстытуту асьпірантуры (гісторыя Захаду).
5. Платун — народны камісар асьветы.
6. Будзінскі—рэдактар газэты «Зьвязда».
7. Шкільтэр — загадчык латыскага сэктару БАН.

СССР у цэнтры увагі эўрапэйскіх палітычных колаў

БЭРЛІН, 4. У «Бэрлінэр тагеблят» зьявіўся новы артыкул публіцыста, які піша пад псэўданімам «Ц» аб савецкіх справах. У гэтым артыкуле аўтар прабуе падаць псыхалягічныя і гаспадарчыя прадпасылкі да «канчатковае перамогі» савецкага ладу. Аўтар сьцьвярджае, што той факт, што «цэнтр цяжкасьці» зацікаўленасьці эўрапэйскае грамадзкае думкі перанёсься цяпер на савецкі «экспрымэнт». «Рашэйшая зацікаўленасьць да чыста ўнутраных спраў СССР, — гаворыць ён, ператварылася цяпер у страх перад магчымымі ў першую галаву эканамічнымі вынікамі савецкае сыстэмы». Звычайныя пытаньні аб «булучым» дзяржаўным ладзе Савецкага Саюзу аўтар артыкулу адхіляе, як неабгрунтаваныя, указваючы на той асноўны факт, што з кожным днём становіцца ўсё больш немагчымым адчуваньне ў Расіі прыватнай уласнасьці, асабліва пры ўзрастаючых посьпехах пяцігодкі, якая ў корані зьмяняе эканамічную структуру краіны. Далей ён канстатуе рост цэнтралізацыі дзяржаўнае ўлады і чыста савецкую ўстаноўку мападога пакаленьня СССР; ён указвае на прагнасьць ведаў, якая ахапіла савецкую моладзь, і на шырокае поле дзейнасьці, якое адкрываецца перад ёю (моладзьдзю) у той час, як у буржуазных краінах высока-кваліфікаваны сілы не знаходзяць прыстасаваньня сваёй працы. «Савецкая дзяржава, — заўважае аўтар артыкулу, — дала нам урок, што вялікая краіна можа кіравацца таксама без акадэмікаў (вышэйшае інтэлігенцыі)».

У наступным артыкуле «Ц» мяркуе разглядзець пытаньне наколькі аптымізм савецкай дзяржаўнасьці знаходзіць сваё пацьвярджэньне ў рэальных гаспадарчых магчымасьцях.

(«Известия»).

45 год на рэвалюцыйным пасту

Калегія Наркамасьветы хадайнічае аб узнагародзе тав. Кона ордэнам Працоўнага сьцягу

Прайшло 45 год са дня асуджэньня ваенным судом у Варшаве і ссылкі на катаргу Фэлікса Якаўлева-КОНА.

Адзін з актыўнейшых арганізатараў польскае рэвалюцыйнае рабочае партыі «Пралетарыят», якая паклала пачатак арганізаванаму змаганьню пралетарыяту Польшчы супроць расійскага самаўладзтва і супроць самай жорсткай эксплёатацыі з боку польскіх капіталістаў і фэадалаў, Фэлікс Кон нязьменна заставаўся на слаўным пасту актыўнейшага змагара за перамогу пралетарскай рэвалюцыі, за перамогу сацыялізму.

4 лютага ў клюбе Наркамасьветы адбылося пашыранае пасяджэньне калегіі Наркамасьветы, прысьвечанае шанаваньню Ф. Я. Кона, з удзелам усіх супрацоўнікаў і прадстаўнікоў работнікаў прафэсыянальнага і самадзейнага мастацтва.

Адкрываючы пасяджэньне калегіі, народны камісар асьветы тав. Бубноў у асобе Ф. Я. Кона вітае слаўных ветэранаў рэвалюцыйнага руху, закладчыкаў фундамэнту нашай рэвалюцыйнай работы.

Пасьля гэтага тав. Б. Е. Этынгоф абмалёўвае слаўны рэвалюцыйны шлях і дзейнасьць Ф. Я. Кона, якога не зламалі 8 год катаргі і ссылкі, бесьперапынныя прасьледваньні, арышты і галеча да самае Кастрычніцкае рэвалюцыі.

Калегія Наркамасьветы, адзначаючы рэвалюцыйныя заслугі Ф. Я. Кона ў змаганьні з царскім самаўладзтвам, за пралетарскую рэвалюцыю і ў справе сацыялістычнага будаўніцтва СССР, пастанавіла хадайнічаць перад ЦВК РСФСР аб узнагародзе тав. Кона ордэнам Працоўнага сьцягу. Акрамя таго пастаноўлена перайменаваць маскоўскую дзяржаўную кансэрваторыю ў вышэйшую музычную школу імя Фэлікса Кона, устанавіўшы ў ёй дзьве стыпэндыі яго імя, а таксама рад стыпэндый у музычных і мастацкіх ВНУ Масквы і Ленінграду.

Адзіны фронт амэрыканскіх місіянэраў і белагвардзейцаў у Харбіне

ТОКІЁ, 31. З Харбіна паведамляюць, што амэрыканскія місіянэры, якія дзейнічаюць пад апекай амэрыканскага консульства ў Харбіне, вядуць узмоцненую работу па нападжаньні сувязяй з бандыцкімі белагвардзейскімі колмі ў Манчжурыі.

Інтэрвэнты рыхтуюцца

З ТРАНСПАРТЫ ЗБРОІ ДЛЯ ПОЛЬЧШЫ

БЭРЛІН, 5. «Дэйчэ Альгэмэйнэ Цэйтунг» паведамляе аб прыбыцьці ў Данцыгскі порт з Швэцыі буйных транспартаў ваенных выбуховых матар'ялаў, прызначаных для польскага ваеннага міністэрства. У лютым чакаецца прыбыцьцё новых транспартаў. За апошнія 14 дзён гэта ўжо трэці транспарт з ваеннымі матар'аламі, прыбыўшы ў Данцыг для Польшчы.

НОВЫЯ СПРОБЫ УЦЯГНУЦЬ НЯМЕЧЧЫНУ У АНТЫСАВЕЦКІ БЛЁК

БЭРЛІН, 6. Буржуазны друк камэнтуе апублікаваны Армэсонам (вядомы францускі журналіст, прыхільнік франка-нямецкага зьбліжэньня) у парыскай часопісі «Эрод Нувэль» плян скарачэньня рэпарацыйных плацяжоў на 50 проц. пры ўмове адначасовага заключэньня нямецка-францускай ваеннай канвэнцыі. Паводле прапановы Армэсона рэпарацыйныя плацяжы Нямеччыны паніжаюцца «накуль толькі на працягу двох год». Адначасова зголна пляну Армэсона павінны быць зьніжаны ваенныя выдаткі на бюджэце як Нямеччыны, так і Францыі на 12 проц.

Правыя газэты крытычна і адмоўна адносяцца да гэтага пляну. Дэмакратычныя органы, у асаблівасьці сацыял-фашысцкі «Форвэртс», адгукаюцца аб плане з вялікай пахвалой. «Форвэртс», як заўсёды ў падобных выпадках, прабуе змазаць сапраўдны сэнс прапановы і выяўляе плян Армэсона, як «даргогую перамогу ідэй пацыфізму».

Прымусовая праца на высьпе Куба

НЬЮ-ЕРК, 5. Як паведамляюць з Гаваны (Куба), ваенныя ўлады прадпісалі начальнікам паліцыі ўнутры краіны прымусова мабілізаваць беспрацоўных для работы на цукровых плянтацыях. Мабілізаваныя павінны працаваць штодня па 14 гадзін, атрымліваючы надзвычай нізкую зарплату. Рабочыя на цукровых плянтацыях, якія адмаўляюцца ад работы, расстрэльваюцца паліцыяй.

У бальшавіцкі бой за кожнае кілё ільну

ПАЧЫНАЕМ ЗАВОЧНЫ СХОД-ПЕРАКЛІЧКУ РАЁНАЎ

12-га лютага выступаюць з інфармацыяй: сакратары Віцебскага, Сураскага, Расонскага і Дрысенскага райкомаў КП(б)Б, старшыні Ветрынскага і Сіроцінскага райвыканкомаў

Да першага сакавіка выканаць поўнасьцю плян ільназагатовак

ПА АПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ, ПА РАСХЛЯБАНАСЬЦІ І БЮРАКРАТЫЧНАЙ НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦІ І—РУЙНУЮЧЫ УДАР

Сьпіс раёнаў,

НАД ЯКІМІ „ЗЬВЯЗДА" БЯРЕ ШЭФСТВА ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ДВУХДЭКАДНІКА ШТУРМУ ПРАРЫВАЎ У ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ:

НАЗВА РАЁНАЎ:	Гадавы план ільназагатовак у тонах.	Процент выканаўня плану на 1 лютага 1931 г.
Віцебскі . . .	420	15,9
Багушэўскі . . .	180	21,3
Бешанковіцкі .	305	26,0
Высачанскі . .	250	37,
Ветрынскі . .	175	3,4
Вульскі . . .	235	19,6
Вушацкі . . .	250	12,5
Гарадоцкі . .	700	30,0
Лепельскі . .	290	20,4
Межанскі . .	300	35,8
Сіроцінск . .	660	24,3
Сураскі . . .	1145	33,8
Селенскі . . .	350	35,7
Полацкі . . .	200	22,7
Расонскі . . .	450	15,6
Чашніцкі . . .	180	37,4
Асьвейскі . .	450	18,5
Боркавіцкі . .	700	40,8
Дрысенскі . .	560	68,4

Даволі бязьдзейнічаць

ЧЭРВЕНЬ, 6. (НАШ. КАР.). Пядаўняя газэта «Зьвязда» сыгналізавала аб тым, што на лесазагатоўчым фронце ў Чэрвеньскім раёне дапушчан прарыў.

Гэты сыгнал аказаўся пустым стрэлам для партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай і іншых грамадзкіх арганізацый Чэрвеньшчыны.

На сёньняшні дзень ніякага паляпшэньня ў рабоце па выкананьні лесазагатоўчага пляну няма.

На 1-га лютага пляны загатовак выкананы на 13,5 проц., пляны вывазкі—толькі... на 8 проц.

Райвыканком пасылае дзесяткі дырэктыў, але нічога ня ведае, што робіцца на месцах.

Выкананьне пасыланых дырэктыў не правяраецца. Партыйнае кіраўніцтва лесазагатоўкамі пастаўлена зусім слаба. Камсамол справамі лесазагатовак не займаецца.

Надежныя органы, іў першую чаргу райсекцыя РСІ, павінны зацікавіцца такой пастаноўкай работы па адказьнейшым фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Вінаватых у сьвядомым зрыве пляну трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Мятла.

Праграма двухдэкадніка

Пры ЦКК РСІ была склікана нарада прадстаўнікоў рэгулюючых і загатоўчых арганізацый, рэдакцый газэт аб правядзеньні двухдэкадніка па штурме прарываў у ільназагатоўках.

Нарада прыняла наступную праграму правядзеньня двухдэкадніка:

1. Удзельнікі нарады пасылаюць у ВІЦЕБСК, ВОРШУ, МАГІЛЕЎ і ГОМЕЛЬ брыгады, якія ў гэтых гарадох мабілізуюць актыў з рабочых і служачых для дапамогі рабкам, што адстаюць па ільназагатоўках.

2. Асноўныя раёны разьмяркоўваюцца паміж газэтамі «ЗЬВЯЗДА», «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», «БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА» і «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА», якія абавязаны сыстэматычна асьвятляць ста новішча ільназагатовак і ход двухдэкадніка ў гэтых раёнах.

Раённыя арганізацыі на месцах мабілізуюць увесь свой актыў для посылкі ў сельсаветы і калгасы.

4. У асноўных раёнах мабілізуюцца на пяць дзён апараты райКК, райпрафбюро, органаў Наркам'юсту і райкому камсамолу, якія павінны ўехаць усе сельсаветы для праверкі выкананьня сельсаветамі дырэктыў ураду па ільназагатоўках.

5. Органы Наркам'юсту арганізоўваюць на працягу гэтых пяці дзён па ўсіх сельсаветах паказальныя суды над кулакамі і заможнымі гаспадаркамі, якія сабатуюць здачу ільну па цьвёрдых заданьнях, над работнікамі савецкага апарату, якія бюракратычна зрываюць дырэктывы ўраду.

6. Раённыя арганізацыі і брыгады з рабочых цэнтраў прымаюць усе меры да абавязковага і поўнага спагнаньня ільну ад кантрактантаў. Над злоснымі парушыцелямі кантрактацыйных дагавораў у сельсаветах арганізуюцца неадкладна паказальныя суды.

7. У часе двухдэкадніка не павінна застацца ў калгасах ніводнага кілё неапрацаванага ільну. Раённыя арганізацыі і брыгады арганізуюць сацпаборніцтва паміж паасобнымі калгасамі на найбольш хуткую апрацоўку і здачу ільну.

8. У часе двухдэкадніка праводзіцца праверка наколькі выкананы дырэктыва ўраду аб прымяваньні калгасьнікаў і рабочых саўгасаў, якія займаюцца апрацоўкай ільну, прамтаварамі ў разьмеры 20 проц. ад іх зарплаты. Таксама правяраюцца, наколькі папулярызаваны дырэктыва ўраду аб прымяваньні за ільназагатоўкі мануфактурай у павышаным разьмеры.

9. Задача двухдэкадніка—дабіцца да 25 лютага 100 проц. выкананьня пляну ільназагатовак. Друк абавязан бязьлітасна выкрываць усіх канкрэтных носьбітаў правага апартунізму, патураньне кулаку на ільназагатоўчым фронце, адначасова заахвочваючы тых арганізацыі, якія здолелі бальшавіцкімі мэтадамі ўзяць лён.

Забясьпечыць бесьперабойную работу загатоўчых пунктаў

4-га лютага пад старшынствам тав. Калініна адбылося пасяджэньне чацьвёркі ЦК КП(б)Б і СНК БССР па пытаньні ільназагатовак.

З дакладаў Наркамгандлю, Белкалгасцэнтру, Белільнакапляводсаюзу і Белкаапсаюзу вынікла, што пераможу ў ільназагатоўках няма. Маецца нават зьніжэньне тэмпаў загатовак за апошнюю пяцідзеўку. Студзеньскі плян сарваны з прычыны бязьдзейнасьці раённых арганізацый. На 1 лютага плян выкананэ усяго на 26,2 проц.

Загатоўчыя пункты фармальна падыходзяць да справы загатовак, лічачы, што ў іх абавязак уваходзіць толькі прыёмка ільну і больш нічога. Ніякай масавай растлумачальнай работы загатоўчыя пункты не вядуць. Праверка здачы кулацка-заможнымі гаспадаркамі ільну па цьвёрдых заданьнях не вядзецца. Загатоўчыя пункты ня ведаюць колькі яны павінны здаваць, а сельсаветы ня ведаюць, колькі імі здадзена на пункты. Дрэнна праходзіць таксама і кантрактацыя. Раённы друк не аддае выстарчальнае ўвагі пытаньню ільназагатовак.

Чацьвёрка абвясьціла з 5 лютага двухдэкадник штурму прарываў у загатоўцы ільну.

Усім цэнтральным і раённым загатоўчым арганізацыям прапанавана прыняць самы шырокі ўдзел у двухдэкадніку, поўнасьцю забясьпечыўшы бесьперабойную работу загатоўчых пунктаў і ўстаналіўшы такі нарадак прыёму ільну, пры якім загатоўчыя пункты вялі б якую колькасьць ільну павінны здаваць кулацка-заможныя гаспадаркі на цьвёрдых заданьнях і сваячасова паведамлялі б сельсаветам аб колькасьці здаванага ільну.

Чацьвёрка абавязала райкомы, райвыканкомы і загатоўчыя арганізацыі разгарнуць шырокую масавую работу за выкананьне дырэктыў, даных ЦК КП(б)Б і ўрадам па ільназагатоўках, з такім разьлікам, каб да 25 лютага, у часе двухдэкаднага штурму быў выкананы увесь плян за люты месяц і недавыкананая частка пляну.

Белкалгасцэнтру прапанавана ўжыць захады да разгортваньня на працягу двухдэкадніка вялікай работы ў калгасах для ўзмацненьня здачы і апрацоўкі ільну з тым, каб пастанова чацьвёркі аб поўнай здачы калгасамі ільну да 20 лютага была-с выкананa поўнасьцю.

Адпачасова ад імя СНК і ЦКК накіравана тэлеграма райкомам і райвыканкомам з даручэньнем неадкладна забясьпечыць поўны пералом у ільназагатоўках, забясьпечыць скончэньне праверкі спагнаньня з кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдых заданьняў, а таксама скончыць спагнаньне закантрактаванага ільну.

Завочны сход-пераклічка

сакратароў райкомаў КП(б)Б і старшынь райвыканкомаў

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і рэдакцыя «Зьвязды» абвяшчаюць завочны сход-пераклічку сакратароў райкомаў КП(б)Б і старшынь РВК па пытаньні аб ходзе ільназагатовак і правядзеньні двухдэкадніка штурму прарываў на ільназагатоўчым фронце.

Першае пасяджэньне адбудзецца 12 лютага.

Сход адкрывае старшыня ЦКК КП(б)Б і нам. старшыні СНК т. Калінін.

На сходзе будуць заслуханы завочныя інфармацыі сакратара Віцебскага райкому КП(б)Б, старшыні Ветрынскага райвыканкому, старшыні Сіроцінскага РВК і сакратароў Сураскага і Расонскага райкомаў КП(б)Б.

Таксама будзе прадстаўлена слова сакратару Дрысенскага райкому КП(б)Б, які павінен паведаміць пралетарскай грамадзкасьці аб тых мерапрыемствах раённай партыйнай арганізацыі, якія забясьпечылі пасьпяховае выкананьне пляну ільназагатовак.

Удзельнікі сходу павінны інфармаваць пралетарскую грамадзкасьць аб прынятых мерапрыемствах па давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак у вызначаных урадам разьмерах, аб ступені іх спагнаньня, аб загатоўцы ільну ў калгасах і індывідуальным сэктары ў парадку самаабавязацельства, аб спагнаньні ільну ад кантрактоўчыкаў.

Дакладчыкі па завочным сходзе павінны паведаміць аб масавай рабоце, праведзенай у раёне, у сувязі з арганізацыяй двухдэкаднага штурму прарываў на ільназагатоўчым фронце.

Непрымірымаму барацьбіту

за ленінізм, жалезнаму бальшавіку—тав. ВАРАШЫЛАВУ

Наркамваенмору СССР—вернаму ленінцу тав. Варашылаву

Мы, прэміяваныя рабочыя г. Менску, сабраўшыся на першы зьлёт, прысьвечаны трэцяму рашаючаму году пяцігодкі, шлём табе, тав. Варашылаў, ударнае бальшавіцкае прывітаньне ў дзень твайго 50-цігадовага юбілею. Пад кіраўніцтвам УсеКП(б) рабочая клясa Савецкага Саюзу дала руйнуючы адпор імпэрыялістам на франтох грамадзянскай вайны і зарыя, пад кіраўніцтвам УсеКП(б) і яе ленінскага ЦК, пасьпяхова завяршае пабудову фундаменту сацыялістычнай эканомікі, выконвае пяцігодку за чатыры гады, ліквідзе кулацтва, як клясу, за базе суцэльнай калектывізацыі. Нашы посьпехі выкліканы шалёную нянавісьць з боку імпэрыялістаў, якія падрыхтоўваюць вайну супроць Савецкага Саюзу.

Мы, прэміяваныя рабочыя, заяўляем, што на першым закліку партыі зьменім зарштаты на вінтоўкі і зьляцімся пад баявыя сьцягі Чырвонай арміі.

Пад кіраўніцтвам УсеКП(б), на чале з табою, дамо руйнуючы адпор імпэрыялістам.

Няхай жыве УсеКП(б) і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве Чырвоная армія і яе кіраўнік тав. Варашылаў!

ДАРАГІ ТАВАРЫШ КЛІМ ВАРАШЫЛАЎ!

Усебеларуская канфэрэнцыя яўрэйскіх культасьветработнікаў шле табе, — кіраўніку Чырвонай арміі і флёту, — гарачае прывітаньне і вітае цябе з 50-гадовым юбілеем.

Мы ведаем цябе, як аднаго з лепшых старых бальшавікоў і правадыроў Чырвонай арміі і флёту, вернага вучня Леніна і актыўнага барацьбіта за дыктатуру пралетарыяту, за міжнародную пралетарскую рэвалюцыю.

Мы ўпэўнены ў тым, што і ў далейшым, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, ты будзеш у першых радох барацьбітоў за правядзеньне генэральнай лініі партыі ў сацыялістычным будаўніцтве і з бальшавіцкай настойлівасьцю і ўпартасьцю стаяць на варце адзінства партыі, абараняючы яе ад наскокаў правых і «левых» апартуністаў.

У твёй асобе мы запэўняем нашу слаўную Чырвоную армію і флёт, што сваёй штодзённай культурнай работай мы будзем дапамагаць яе далейшаму культурнаму росту і, стоячы ля брамы нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны, будзем заўжды гатовы са зброяй у руках абараняць СССР ад імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі.

50-ці годзьдзе тав. Варашылава адзначаюць магутнай хваляй творчага ўздыму

50-цігодзьдзе правадыра Чырвонай арміі — тав. Варашылава палкавая школа № 5-снага палка адзначае новай магутнай хваляй творчага ўздыму камандніка складу і ўсёй курсанцкай масы па барацьбу за сапраўды ўдарныя, бальшавіцкія тэмпы выкананьня пляну баявой падрыхтоўкі, узмацненьня баявой магутнасьці Чырвонае арміі, за генэральную лінію партыі і яе бальшавіцкага ЦК, за выкананьне і перавыкананьне пляну трэцяга году пяцігодкі.

36 курсантаў — лепшых ударнікаў, адданых і стойкіх барацьбітоў, паказаўшых на справе сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў баявой падрыхтоўцы за трохмесячнае знаходжаньне ў школе, — абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя тав. Варашылава і ўзяліся скончыць школу да рыхаду ў лягер. Каманда варашылаўцаў ужо складзена, выпрацавана праграма і з 6 лютага каманда пачала сваю работу на новай праграме.

Рацыяналізатары складаюць фонд рацыяналізатарскіх прапаноў імя тав. Варашылава; сабрана ў гэты фонд 37 прапаноў.

Школа адпрацавала нядзельнік і атрыманыя грошы ўносіць на дырыжабль «Клім Варашылаў». Па клясах праводзіцца збор сродкаў на пабудову дырыжабля. Аднагодзікі сабралі 10 рублёў, трэцяя класа — 12 руб. Праводзіцца збор у першай і другой клясах.

Камсамол перадае ў сталёвыя рады партыі Леніна 12 лепшых камсамольцаў.

8 лепшых ударнікаў-варашылаўцаў зьвярнуліся ў партыйную ячэйку з просьбай прыняць іх у рады партыі.

Прывітаньне ад ЦК ангельскае кампартыі

ЛЁНДАН, 5. Цэнтральны камітэт ангельскай кампартыі накіраваў тав. Варашылаву прывітаньне, у якім гаворыцца: «Усё большая колькасьць ангельскіх рабочых з гонарам глядзіць на магутнасьць і дасягненьні Чырвонай арміі, якой вы кіруеце з першых дзён Кастрычніка. У імпэрыялістаў і іх рэфармісцкіх лёкаеў ваша імя выклікае жах і нянавісьць, у пралетарыяце яно выклікае гонар, надзею і ўпэўненасьць у перамозе пралетары

ЗАДАЧАМ ЗМАГАНЬНЯ за ПРАМФІНПЛЯН— падпарадкаваць работу вытворчых парткалектываў

Ачышчаючы свае рады ад апартуністаў, выкарчоўваючы праваапартуністычную практыку—з яшчэ большай настойлівасьцю ўкараняць сацыялістычныя мэтады работы на вытворчасьці

З бальшавіцкай упартасьцю

змагацца за прамфінплян

Партыйныя арганізацыі фабрык і заводаў правялі вялікую работу па падрыхтоўцы да трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Гэта падрыхтоўка суправаджалася яшчэ большым ростам актыўнасьці рабочых мас, што выразна выявілася ў высоўваньні сустрэчных прамфінпляноў, росьце ўдарных брыгад, яшчэ большым уздыме хвалі сацыялістычнага спаборніцтва. Усё гэта дае поўную магчымасьць канстатаваць, што ў асноўным парткалектывы большасьці фабрык і заводаў правялі выстарчальную работу па мабілізацыі рабочых мас на выкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Аднак, было-б вялікай палітычнай памылкай сьцьвярджаць, што такое становішча мы маем на ўсіх абсалютна прадпрыемствах. На сёньняшні дзень мы можам паказаць рад фабрык і заводаў (у Віцебску, у Барысаве і інш. прамысловых цэнтрах), дзе мабілізацыя шырокіх рабочых мас вакол вытворчых праграм праведзена вельмі дрэнна, а ў горшым выпадку—не праведзена зусім. Ёсьць рад фабрык і заводаў, дзе замі вытворчыя праграмы яшчэ не даведзены ня толькі да кожнага цэху, да кожнага рабочага, а ўсё яшчэ вандруюць па ўстановах «на прадмет зацьвярджэньня». Так іменна стаіць справа на «Чырвоным Мэталісьце», дзе ўжо мінула 5 раз мяняліся заданьні, а нарэшце, і да сёньняшняга дня рабочыя ня ведаюць сваёй праграмы.

Адсутнасьць работы з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый, а таксама гаспадарнікаў на радзе прадпрыемстваў па выяўленьні магчымасьці найбольш поўнага і рацыянальнага скарыстаньня ўнутраных рэсурсаў, адсутнасьць гібкасьці ў справе рэагаваньня і ліквідацыі розных тэхнічных няўдазок прывяла да прарываў у выкананьні прамфінпляну ў студзені. Парт'ячэйкі асобных прадпрыемстваў («Шлях індустрыялізацыі», фабрыка акуляраў, Добруская фабрыка і інш.) ня сталі на чале барацьбы мас за высокія колькасныя і якасныя паказэльнікі ў выкананьні прамфінпляну, ня сталі на чале змаганьня з прагульшчыкамі, рвачамі і кулацкімі агентамі, што пралезьлі на сацыялістычныя фабрыкі і заводы. Чаго вэрты такі факт, калі адзін з сакратароў парт'ячэйкі на ДОБРУСКАЙ фабрыцы забараніў нават вывесіць на чорную дошку падрыўшчыкаў ударных тэмпаў работы на прадпрыемстве.

Замест таго, каб яшчэ вышэй узьнімаць хвалю сацспаборніцтва і ўдарніцтва, парт'ячэйкі асобных прадпрыемстваў ня толькі ня сталі на чале рабочай ініцыятывы, а, апынуўшыся ў балоце апартунізму, падрывалі яе. Так іменна стаіць справа на фабрыцы «Краскацьвет» (Лоеўскі раён).

Зводкі выкананьня прамфінпляну з асобных прадпрыемстваў за студзень сыгналізуюць аб тым, што некаторыя партарганізацыі ня здолелі адразу-ж узяць бальшавіцкі разгон у выкананьні прамфінпляну ў трэцім годзе пяцігодкі. Гэта прымушае з ўсёй вострасьцю паставіць пытаньне перад усімі вытворчымі парткалектывамі аб неадкладным узмацненьні свайго змаганьня за прамфінплян, аб яшчэ большай мабілізацыі шырокіх мас рабочых на выкананьне вызначаных праграм. Толькі выкарчоўваючы права-апартуністычную практыку, толькі вядучы сыстэматычнае змаганьне з прагульшчыкамі, рвачамі, партыйныя арганізацыі здолеюць забясьпечыць выкананьне прамфінпляну. Толькі ўзьнімаючы на вышэйшую ступень сацспаборніцтва і ўдарніцтва, парт'ячэйкі даб'юцца выкананьня тых задач, якія паставілены сьнежаньскім пленумам ЦК УсеКП(б) і студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б.

Магільшчыкі рабочай ініцыятывы

Завод «Краскацьвет» (Лоеўскі раён) дачёка ня выканаў прамфінпляну асобнага кварталу як па колькасных, так і па якасных паказальніках. Партыйная ячэйка заводу ня ўлічыла ўсёй важнасьці і значэньня мабілізацыі рабочых на выкананьне прамфінпляну, ня ўлічыла таго, што зрыў работы на заводзе зьнижае экспарт.

Асноўнай прычынай невыкананьня прамфінпляну зьявілася тое, што сярод рабочых ня было адпаведным чынам разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Характэрна, што ні парт'ячэйка, ні заўком не падтрымалі ініцыятывы рабочых па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва між дэхамі і асобнымі брыгадамі. Рабочыя па сваёй ініцыятыве заключалі дагаворы, у якіх бралі на сябе абавязкі добрасумленна адносіцца да абсталяваньня, узьняць прадукцыйнасьць працы, зьнізіць процант браку і ня толькі выканаць, але і перавыканаць заданьні. Але заўком дагаворы аб сацспаборніцтве, якія заключалі ў сабе гатоўнасьць змагацца за лепшыя паказальнікі, палажыў пад сукно і па сутнасьці апынуўся ў ролі магільшчыка рабочай ініцыятывы.

На сутнасьці партыйная ячэйка і заўком адмовіліся кіраваць сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, адмовіліся арганізаваць рабочых на выкананьне задач трэцяга году пяцігодкі. Апартуністы з бюро партыйнай ячэйкі лічаць, што прамфінплян заводам можа быць выкананы без спаборніцтва, без мабілізацыі актыўнасьці рабочых на выкананьне прамфінпляну.

Нельга не адзначыць і таго, што партыйная ячэйка займала ганебныя пазыцыі ў пытаньні барацьбы з прагульшчыкамі, рвачамі, якія аслаблялі і дэзарганізавалі намаганьні рабочага калектыву. Вакол прагульшчыкаў ня была мабілізавана грамадзкая думка, ня быў дан рашучы адпор людзям, якія заместь змаганьня за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ўпарта абараняюць свае асабістыя інтарэсы і працуюць на заводзе, выключна выходзячы з іх.

На заводзе не забясьпечана правядзеньне дырэктыў партыі аб адзіначальні. Існуе такая сыстэма, пры якой распаджэньні дырэктара скасоўваюцца яго намесьнікам і наадварот, і ўсё гэта, нарэшце, прыводзіць да блытаніны, да розных непаразуменьняў і да зрыву прамфінпляну. Партыйная ячэйка стаяла ў баку ад гэтага важнейшага пытаньня. Яна не пацікавілася, як выконваюцца дырэктывы партыі аб адзіначальні, не прыцягнула да адказнасьці асобных гаспадарнікаў, якія адзіначальне падмяняюць гульнёй у «жмуркі».

Кіраўніцтва партыйнай ячэйкі, займаючы апартуністычныя пазыцыі ў пытаньні мабілізацыі мас на выкананьне прамфінпляну, ні ў якім разе ня здольна забясьпечыць выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Лоеўскі райком партыі да гэтага часу не прагерыў, як партыйная ячэйка заводу «Краскацьвет» выконвае генэральную лінію партыі, як яна змагаецца з усякімі адхіленьнямі ад ленінскай лініі. Райком ня ўжыў ніякіх захадаў, каб аздаравіць партыйную ячэйку заводу, каб выкінуць з партыі апартуністаў, каб арганізаваць рабочых на ліквідацыю прарыву ў выкананьні прамфінпляну і гэтым самым расчысьціць шлях рабочай ініцыятыве.

Апартуністычнае кіраўніцтва заводу «Краскацьвет» павінна оыць зьнята, як раздольнае ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі.

КАР.

Прарывы на віцебскіх прадпрыемствах

—рэзультат слабай барацьбы з апартуністычнай практыкай

На большасьці буйнейшых прадпрыемстваў гор. Віцебску студзеньскі прамфінплян ня выкананы. Прарывы ў выкананьні прамфінпляну вызначыліся ў пачатку студзеня і ў наступных дэкадах павялічваліся. Так, па 16 прадпрыемствах плянавыя заданьні ў першую дэкаду выкананы на 88,5 проц., у трэцюю пяцідзёнку выкананьне зьніжаецца да 86,8 проц. і ў чацьвертую—да 82,8 проц.

У сярэднім плян па колькасных паказальніках за 20 дзён студзеня месяца па «Чырвоным мэталісьце» выкананы на 51,5 проц., «Дзьвіне»—на 79,8 проц., акулярнай фабрыцы — на 84,0 проц. і абутковай імя Лекерта—на 93,3 проц.

Ня гледзячы на буйныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну па колькасных паказальніках, не адсутнасьць перапому ў справе паляпшэньня якасьці прадукцыі, кіруючыя арганізацыі прадпрыемстваў ня ўжывалі адпаведных захадаў для мабілізацыі рабочай грамадзкасьці на ліквідацыю гэтых прарываў, па зьнішчэньне меўных месца недахопаў тэхнічнага парадку. Многія партыйныя калектывы не перабудавалі партыйнай работы на прадпрыемствах у сэнсе перанясеньня ўсяго цяжару работы ў нізавыя вытворчыя зьвенні. Замест бальшавіцкай работы, на вытворчасьці заместь напружаньня ўсіх сіл на забясьпечэньне выкананьня вытворчай праграмы, парткіраўніцтва некаторых прадпрыемстваў, фабзаўкомы, гаспадарнікі імкнуцца апраўдываць прарывы выключна «аб'ектыўнымі» прычынамі, зьяшць з сябе віну апартуністычнай практыкі.

Наколькі беспадстаўны гэтым апартуністычныя разважаньні аб «аб'ектыўных» прычынах, выразна сьведчаць такія факты, што на заводзе «Чырвоны мэталіст» стваравоцца прастоі па віне адміністрацыі, якая не клапацілася аб своячасовым забясьпячэньні апаламі заводу. На фабрыцы «Дзьвіна» таксама рабіліся прастоі з-за непадвозу да калагарні торфу, які знаходзіўся на блізкай адлегласьці ад прадпрыемства. З-за няўвязкі работы паміж цэхамі бываюць частыя прастоі па акулярнай і швейнай фабрыках.

На некаторых прадпрыемствах яшчэ да гэтага часу няма ў канчатковай форме зацьвярджаных прамфінпляну (Віцебскі і імя Лекерта). Ёсьць такія прадпрыемствы, дзе прамфінплян ня толькі не даведзен да кожнага рабочага ў сэнсе канкрэтнага заданьня, а нават не даведзен да цэху.

Партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах не мабілізавалі грамадзкай думкі вакол задач паляпшэньня якасьці прадукцыі. У выніку нізкагатунковасьць і брак на паасобных прадпрыемствах (імя Лекерта, імя Клары Цэткін) маюць тэндэнцыю да павялічэньня. Найбольш глыбокія прарывы ў выкананьні прамфінпляну прыпадаюць на тыя прадпрыемствы, дзе слаба разгорнута работа мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, дзе слаба вядзецца барацьба заўмацненьне працоўнай дысцыпліны мэтадамі грамадзкай уэдзейнасьці, дзе апартуністы—супрацўленцы бальшавіцкім тэмпам работы не сустракаюць рашучага адпору з боку парт'ячэек.

Віцебскі гарком павінен неадкладна заняцца выяўленьнем стану партыйнай работы на прадпрыемствах і ўжыць рашучыя меры ў адносінах да парткіраўніцтва тых прадпрыемстваў, дзе не забясьпечваецца выкананьне прамфінпляну па віне пануючай там праваапартуністычнай практыкі.

Л.

Сакратар ячэйкі пакрывае прагульшчыкаў

Плянавыя заданьні ў асобным квартале добрускай фабрыкай «Гэрой працы» недавыкананы на 18,6 проц. Недавыкананьне прамфінпляну адбылося, ня гледзячы на гэрайчае змаганьне дзесяткаў і соцень лепшых ударнікаў, сапраўдных пралетараў, адданых сацыялістычнаму будаўніцтву. Рабочы калектыў фабрыкі, атрымаўшы сьцяг ад ЦВК БССР за гэрайчую работу па выкананьні прамфінпляну ў мінулым для таго, каб бяз бою не аддаць ганаровага сьцягу, мабілізаваў сябе на перамаганьне труднасьцяй, зьвязаных са змаганьнем па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну.

Падводзячы вынікі асобнага кварталу, рабочы калектыў быў зьдзіўлен і абураны тым, што фабрыка ў асобным квартале працавала значна горш, чым у апошнім квартале мінулага гаспадарчага году, тым, што дзесяткі людзей сваёй невыстарчальнай, нядбайнай работай зрывалі гэрайчае змаганьне рабочага калектыву за прамфінплян.

Ні партыйны камітэт фабрыкі, ні фабком ня здолелі адказаць рабочаму калектыву, чаму фабрыка ў асобным квартале ня выкапала плянавых заданьняў, чаму працавала горш у параўнаньні з другім годам пяцігодкі.

Партарганізацыя і прафорганы, прымаючы прыгожыя рэзалюцыі аб падтрыманьні ініцыятывы рабочых-ударнікаў, аб забясьпячэньні сапраўды канкрэтнага кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, аб рашучым змаганьні з дэзарганізатарамі і прагульшчыкамі, з правымі апартуністамі і «левакамі»,—у той-жа час ня здолелі перанесьці цяжар усёй партыйнай і прафсаюзнай работы ў цэх, зьмену, брыгаду, у пасобныя найбольш адсталыя групы рабочых. Парткіраўніцтва не зауважыла, што за сьпіной большасьці рабочых, якія не на словах, а на справе змагаюцца за прамфінплян, за ганаровы чырвоны сьцяг ЦВК, знаходзіліся людзі, якія сыстэматычна ня выконвалі заданьняў па прамфінпляне, якія прадукцыйнасьць працы і гэтым самым зрывалі работу лепшых ударных брыгад і соцень ударнікаў.

На фабрыку пралезьлі сацыяльна-варожыя кулацкія элемэнты, якія, прыкрываючыся імем рабочага, праводзілі шкодніцкую работу, выконвалі сацыяльны заказ клясавага ворага. Грамадзкія арганізацыі фабрыкі не праявілі патрэбнай пільнасьці, каб ачысьціць рабочы калектыў ад сацыяльна-варожых элемэнтаў.

Прагульшчыкі, п'яніцы, нядбайнікі па-шкодніцку адносячыся да варштатаў, інструмантаў і абсталяваньня, выклікалі прастоі з-за псаваньня варштатаў і абсталяваньня. Мы канстатуем, што асобныя цэхавыя парт'ячэйкі і адміністрацыя замест таго, каб мабілізаваць увагу ўсяго рабочага калектыву на выкрываньне злачыннай дзейнасьці прагульшчыкаў, рвачоў, нядбайнікаў, вельмі часта аб'ектыўна спрыялі апошнім. Так, сакратар парт'ячэйкі Папоў катэгарычна забараніў вывешваць на чорную дошку прагульшчыкаў.

Аб тым, наколькі партарганізацыя здолела сапраўды павярнуцца тварам да вытворчасьці, перабудаваць сваю работу і падтрымаць ініцыятыву рабочых-ударнікаў, наколькі яна забясьпечыла шырокае разгортваньне самакрытыкі, сьведчаць факты аб тым, што па фабрыцы ёсьць дзесяткі выпадкаў цкаваньня лепшых рабочых-ударнікаў, раб кораў, ініцыятараў арганізацыі вытворчых камун, ударных брыгад і г. д.

Партарганізацыя не ўзала пад сваю абарону рабкораў, якія падпадалі жорстакім нападам з боку прагульшчыкаў, рвачоў і сацыяльна-варожых элемэнтаў. Партыйныя ячэйкі замест таго, каб рашуча ўдарыць па глушыцелях самакрытыкі, стваралі па некалькі камісій, якія, па сутнасьці не расьследавалі фактаў, а зьбіралі кампрамэтуючы матар'ял на рабкораў, каб апошніх выключыць з партыі.

Мы падкрэсьливаем, што пры такім становішчы партыйнага кіраўніцтва, пры такіх адносінах да ініцыятывы рабочых, да разгортваньня сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі, рабочы калектыў фабрыкі ня зможа з посьпехам змагацца за выкананьне заданьняў трэцяга году пяцігодкі.

Рабочыя.

У баку ад вытворчых задач

Каля 3-х месяцаў таму назад пушчана швейная фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» (Віцебск). На фабрыцы працуе больш за паўтары тысячы чалавек. У складзе рабочых фабрыкі знаходзіцца значная колькасьць упяршыню працуючых на прадпрыемстве, якія прышлі на фабрыку з вёскі і ад дробна-ўласьніцкіх, саматужных прамыслаў.

Гэтых асабліваськцяй фабрыкі бюро парт'ячэйкі ня ўлічыла, не разгарнула на прадпрыемстве масавай работы па выхаваньні маладой праслойкі рабочых, па прышчапленьні ім сьвядомых адносін да работы на сацыялістычным прадпрыемстве. Сярод некаторай найбольш адсталай частні рабочых разьвіты рэакцыя тэндэнцыі, адсутнічае працоўная дысцыпліна, пануюць нядбайныя адносіны да якасьці прадукцыі. Аднак барацьба з гэтымі пераларовымі зьявішчамі праводзіцца неыстарчальна, не мабілізавана грамадзкасьць вакол задач напружанага змаганьня за выкананьне вытворчай праграмы прадпрыемства. Толькі гэтымі прычынамі тлумачыцца невыкананьне прамфінпляну і палучэньне 10.000 пар штаноў браку, якія ляжаць на фабрыцы мёртвым капіталам і без пераробкі ня могуць быць рэалізаваны.

Аб безадказных адносінах з боку бюро парткалектыву да разгортваньня масавай работы на прадпрыемстве сьведчыць той факт, што да гэтага часу не арганізавана на прадпрыемстве фабком, што пытаньні разгортваньня на фабрыцы сацспаборніцтва і ўдарніцтва не займаюць цэнтральнага месца ў рабоце партыйнай арганізацыі. Самакрытыка, як мэтад выкрываньня апартуністычнай практыкі, не разгорнута. Партыйнае кіраўніцтва фабрыкі недаацэньвае важнасьці пралетарскай самакрытыкі і ня спрыяе яе разгортваньню.

Для рэагаваньня на ўсе недахопы, якія ёсьць на фабрыцы, праведзен нечарговы зьлет рабкораў, на якім была абвешчана рабкораўская трывога і вызначаны маршруты для налёту рабкораўскіх брыгад. Апрача гэтага рабкоры прапанавалі правесьці лятучыя сходы рабочых на цэхах з мэтай завастрэньня ўвагі на задачах ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну і вярбоўкі новых рабочых у рады ударнікаў. Але сакратар парт'ячэйкі не падтрымаў ініцыятывы рабкораў і заявіў, што ён лічыць непатрэбным склікаць сходы рабочых. Такія адносіны кіраўніка парт'ячэйкі сьведчаць аб яго прымірэнчых адносінах да тых адмоўных зьявішч, якія маюць месца на фабрыцы. Становішча на фабрыцы напружанае. Для таго, каб ліквідаваць прарывы, трэба выкарчоўваць апартуністычную практыку, якая ёсьць у рабоце кіруючых органаў прадпрыемства, трэба шырока разгарнуць масавую работу на мабілізацыі актыўнасьці рабочых на выкананьне прамфінпляну.

М. КЛІЁНСКІ.
Г. КАГАН.

Кіраўніцтва парт'ячэйкі Дзяржпляну не забясьпечыла правядзеньне генэральнай лініі партыі

За праваапартуністычную практыку, заціск самакрытыкі, адсутнасьць работы па выкрыцьці контр-рэвалюцыйных шкодніцкіх элемэнтаў у апараце бюро ячэйкі КП(б)Б Дзяржпляну распушчана

ПАСТАНОВА Б�ЮРО МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б АБ РАБОЦЕ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б ДЗЯРЖПЛЯНУ БССР

1. Заслухаўшы і абмеркаваўшы вынікі праверкі і становішча яч. КП(б)Б Дзяржпляну БССР, Бюро Менскага гаркому КП(б)Б КАНСТАТУЕ: што апарат Дзяржпляну БССР, задачай якога зьяўляецца кіраўніцтва пляваньнем сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі, у асобных сваіх зьвеньнях знаходзіўся пад уплывам буржуазных спэцыялістаў, варожых пралетарскай дыктатуры, у практычнай працы праводзіўшых шкодніцкую лінію на зрыў сацыялістычнага будаўніцтва і рэстаўрацыю буржуазнага ладу ў БССР, што знайшло найбольш яркі вдбітак у шкодніцкім пляваньні асобных галін народнай гаспадаркі. Толькі вялізарнейшая актыўнасьць і магутны творчы энтузіязм рабочых класы, мабілізаваны вакол генэральнай лініі партыі, наперакор шкодніцкай работе буржуазных спэцыялістаў, забясьпечыў выкананьне і перавыкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва і паступальны рух БССР як частні СССР, па шляху завяршэньня фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

2. Такое становішча ў Дзяржпляне магло стварыцца толькі ў выніку таго, што парт'ячэйка і, асабліва, асобныя камуністы—кіраўнікі не праявілі неабходнай клясавай пільнасьці, а, наадварот, дапусьцілі поўную адсутнасьць усялякага кантролю над работай буржуазных спэцыялістаў, фактычнае штампаваньне іх шкодніцкіх плянаў. Прытупленьне клясавай пільнасьці дайшло нават да супраўцёленьня арабочаньню і знамунізіваньню апарату ў той час, калі апарат Дзяржпляну і на сёньняшні дзень засьмечан чужымі і варожымі элемэнтамі. Пастаноўка работы апарату Дзяржпляну ня толькі ня спрыяла лепшаму выкананьню вялізарнейшых задач, усклядзеных на яго, а наадварот, паўнейшая бяссыстэмнасьць у яго рабоце, адсутнасьць усялякай увязкі па між асобнымі сэкцыямі, адсутнасьць кантролю і праверкі выкананьня — далі магчымасьць конто - рэвалюцыйным элемэнтам з найбольшай лёгкасьцю праводзіць свае шкодніцкія тэорыі 1 пра ектаваньні.

3. Бюро яч. КП(б)Б і кіраўніцтва Дзяржпляну ня здолелі забясьпечыць у рабоце апарату правядзеньне генэральнай лініі партыі, ня здолелі мабілізаваць партыйную і беспартыйную масу на барацьбу з контр - рэвалюцыйнымі шкодніцкімі элемэнтамі ў апараце, з расхлябанасьцю, бюракратызмам, цягаціцтвай і ўпадкам працоўнай дысцыпліны. Бюро ячэйкі ня ўлічыла і прайшло міма ўрокаў і сыгналаў, атрыманых усёй КП(б)Б і асабліва менскай арганізацыяй у зьвязку са справамі БАН, НКЗему, НКСьветы, Крытыка і самакрытыка, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, як важнейшыя сродкі ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, як важнейшыя спосабы падняцьця актыўнасьці, працоўнай дысцыпліны і паляпшэньня работы апарату ня толькі не знайшлі адбітку ў рабоце партыйных і грамадзкіх арганізацый Дзяржпляну, а, наадварот, бюро яч. выступіла ў ролі глушыцеля самакрытыкі, дапусьціўшы разам з МК грубы заціск самакрытыкі.

Выходзячы з гэтага, бюро Менгаркому КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1) Вывады і прапановы камісіі зацьвердзіць.

2) Галоўнай увагай і асноўным зьместам у рабоце ячэйкі на бліжэйшы перыяд павінна быць барацьба за зьнішчэньне рэштак шкодніцтва ў тэорыі і практыцы пляваньня, рашучая крытыка і перагляд усёй мінулай прадукцыі, зафіксаванай у дакумантах Дзяржпляну, рашучае ачышчэньне апарату ад чужых і бюракратычных элемэнтаў і тых, якія да апошняга часу былі зьвязаны з ўлыпымі шкодзінкамі.

3) Важнейшым сродкам пасьпяховай барацьбы з рэшткамі шкодніцтва і бюракратызму і забясьпячэньня скараньня сапраўды адпавядзючага задачам шпаркіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва пляну — зьяўляецца рашучая перабудова работы Дзяржпляну на падставе актыўнага ўдзелу рабочых мас у складаньні і абгаварэньні народнагаспадарчага пляну шляхам вынесьненьня яго на абгаварэньне рабочай грамадзкасьці і поўнага скарыстаньня і ўвязкі з народна - гаспадарчым плянам сустрэчнага прамфінпляну, як найбольш яркага праяўленьня рабочай актыўнасьці. Для ажыцьцяўленьня сапраўднага пралетарскага ўплыву на работу Дзяржпляну зараз-жа арганізаваць рабочае шэфства над Дзяржплянам. Прапанаваць агітмасавзму аддзелу выпускаць адно з буйных прадпрыемстваў гораду і аформіць прыняцьце шэфства.

4. Прасіць ЦКК КП(б)Б паскорыць чыстку апарату Дзяржпляну.

5. Прасіць ЦК і ЦКК прыцягнуць да партыйнай адказнасьці ўсіх камуністаў, былых кіраўнікоў Дзяржпляну, вінаватых у такім становішчы ў Дзяржпляне.

6. Лічыць немагчымым пакіданьне на рабоце ў Дзяржпляне тав. Гольдштэйна, які ня здолеў забясьпечыць у сваёй рабоце правядзеньне генэральнай лініі партыі, аказаўся пад уплывам буржуазных спэцыялістаў.

7. Бюро яч. КП(б)Б, на здолеўшае забясьпечыць у рабоце Дзяржпляну правядзеньне генэральнай лініі партыі, фактычна праводзіўшае ў асноўных пытаньнях права - апартуністычную практыку, дапусьціўшае грубы заціск самакрытыкі, — РАСПУСЬЦІЦЬ.

8. Прапанаваць фракцыі ЦП саюзу саўгандальспужачых распусьціць МК Дзяржпляну, як нездолеўшы стаць на чале разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва і нязлоўшы мабілізаваць масу на барацьбу за паляпшэньне апарату, за падняцьце працоўнай дысцыпліны.

9. Бюро Гаркому заклікае ўсю партарганізацыю і асабліва парт'ячэйкі савкупкага і гаспадарчага апарату павесьці бязьлітасную барацьбу супроць усялякіх элемэнтаў папітычнай блізарукасьці і страты клясавай чуласьці з боку асобных камуністаў, выкарчоўваючы на падставе шырока разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі праўленьні бюракратызму, правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва да іх. Толькі гэтым шляхам, павысіўшы ролю парт'ячэек, асобных членаў партыі, асабліва камуністаў, — кіраўніноў у апараце, ачысьціўшы яго ад нягодных элемэнтаў, савецкія яч. здолеюць стаць сапраўднымі праваднікамі генэральнай лініі партыі ў рабоце савецкіх і гаспадарчых устаноў.

На барацьбу за выкарчоўваньне рэштак шкодніцтва ў Дзяржпляне БССР

«Вядома, у аснове шкодніцтва ляжыць клясавая барацьба. Вядома, клясавы вораг шалёна супраціўляецца сацыялістычнаму наступленьню. Але аднаго гэтага для вытлумачэньня такога пышнага росквіту шкодніцтва мала. Як магло здарыцца, што шкодніцтва набыло такія шырокія разьмеры?

Хто вінават у гэтым? Мы ў гэтым вінаваты. Калі-б мы справу кіраўніцтва гаспадаркай паставілі інакш, калі-б мы значна раней перайшлі да вывучэньня тэхнікі справы і аўладаньня тэхнікай, калі-б мы часьцей і больш талкова ўмешваліся-б у кіраўніцтва гаспадаркай, шкоднікам не ўдалося-б так многа нашкодзіць. Трэба самім стаць спэцыялістамі, гаспадарамі справы, трэба павярнуцца тварам да тэхнікі, тварам да тэхнічных ведаў, — вось куды штурхае нас жыцьцё». (З прамовы тав. СТАЛІНА на ўсесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці).

Становішча, якое стварылася ў Дзяржпляне БССР, выкрытыя Менгаркомам факты разлажэньня, скрыўленьня клясавай лініі, шкодніцтва і нядыпазнасьць у рабоце апарату павінны прыкаваць да сябе ўвагу ўсёй менскай партыйнай арганізацыі, усёй КП(б)Б. На ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, на фронце культурным (ВАН), на фронце аграрным (прышчэпаўшчына), цяпер на фронце пляваньня мы нападаем на сьляды контр-рэвалюцыйнай работы, шкодніцкіх, вялікарускіх шавіністаў, беларускіх нацдэмаў, беларускіх Кандрацьцевых і Громанаў, якія пралезьлі ў нетры навых савецкіх і навуковых устаноў і тварылі там сваю агідную работу, накіраваную на зрыў сацыялістычнага будаўніцтва і рэстаўрацыю капіталізму ў БССР. «Шкодніцтва, — зазначае XVI зьезд партыі, — якое зьяўляецца праяўленьнем клясавага змаганьня, становіцца магчымым і значна абгрунтоўваецца ня толькі з прычыны недахвату нашых савецкіх кадраў, але і з прычыны таго, што многія члены партыі і ў асабліваські паасобныя камуністы-кіраўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў, не праяўляюць неабходнай пільнасьці, а часам у практычнай рабоце знаходзяцца пад уплывам і ўзьдзейнічаньнем шкоднікаў». Гэта ўказаньне XVI зьезду партыі ў найбольш яскравай форме пацьвярджаецца матар'ялямі агляду працы Дзяржпляну БССР. На прыкладзе ячэйкі КП(б)В Дзяржпляну мы бачым, як у некаторых савецкіх ячэйках зьвіў сабе гняздо махровых правых апартуністаў і як праз яго, карыстаючыся аслабленьнем клясавай пільнасьці паасобных кіраўнікоў, прабівалі сабе дарогу і мелі магчымасьць бескантрольна тварыць сваю справу шкодніцтва. Вось чаму ўрокі ячэйкі Дзяржпляну павінны быць улічаны ўсёй партыйнай арганізацыяй. Правая практыка кіраўніцтва Дзяржпляну павінна быць выкрыта да канца перад усёй партыяй, рэшткі шкодніцтва павінны быць вырваны з карэньнямі.

Абсьледваньне Дзяржпляну паказвае, як практычная работа ў пляваньні грунтавалася на буржуазнай, контр-рэвалюцыйнай, шкодніцкай ідэалёгіі Кандрацьцева, Громана, прышчэпаўшчыны і тэорыі самабытнасьці БССР. У аснову «Матар'ялаў па пяцігадовым пляне БССР» фактычна была пакладзена прышчэпаўская пяцігодка сельскай гаспадаркі, пяцігодка рэстаўрацыі капіталізму у сельскай гаспадарцы. У гэтых «матар'ялах», якія прадстаўляюць сабой махровыя права-апартуністычны дакумант, разьвіваліся тэорыі аб тым, што «асаблівых пэрспэктыў на значнае павялічэньне плошчы саўгасаў і калгасаў ня можа быць. Усе гэтыя гаспадаркі былі арганізаваны на землях дзяржаўнага фонду пры нацыяналізацыі зямель непрацоўных уласьнікаў (вось як разумеецца нацыяналізацыя зямлі!). У цяперашні час увесь гэты фонд вычарпаны і далейшых магчымасьцей стварэньня з яго саўгасаў ці калгасаў няма» («Матар'ялы» стар. 38). На тэй-жа старонцы даводзіцца, што прадукцыйнасьць калгасаў і саўгасаў «крыху ніжэй прадукцыйнасьці зямель працоўнага зямлякарыстаньня: на 1 дзесяціну зямлі сельска-гаспадарчага карыстаньня прыпадае валавой прадукцыі ў даваеннай адэнцы ў саўгасах і калгасах 62,1 руб., а адпаасобных гаспадарках—61,6 руб.». На стар. 32 гаворыцца аб тым, што «няма таксама пэрспэктыў па расшырэньні ў бліжэйшыя гады сярод сялянскіх гаспадарак трактараў», а далей ідзе дробна-буржуазная, права-апартуністычная балбатня аб пераразе каня перад трактарам у сельскай гаспадарцы і г. д. Права-апартуністычны кулацкі характар гэтых выказваньняў зусім ясны. Тым больш дзіўна, што былыя кіраўнікі Дзяржпляну, пад радакцыяй якіх вышлі гэтыя «матар'ялы», да гэтага часу ня выступілі адкрыта ў друку з выкрыцьцём контр-рэвалюцыйнай сутнасьці гэтага дакументу і не адмежаваліся ад яго. Тут-жа трэба ўспомніць, што ў адказ на крытыку гэтых «матар'ялаў» тав. Пінчуком у часопісі «На аграрном фронте» ў 1928 г., пасьледвала заметка ў «Бальшавіку Беларусі» № 11 за 1928 г., стар. 107 за подпісам «М» (радакцыя «Бальшавіка Беларусі» павінна адкрыць гэты псэўдонім), пад назваю «Ці так», у якой аўтар бярэ пад сваю абарону гэтыя «Матар'ялы» з пункту гледжаньня тэорыі самабытнасьці БССР і гаворыць, што «такім чынам, тав. Пінчук ня мае рацыі, жадаючы фразу «асаблівых пэрспэктыў... ня можа быць» абярнуць у фразу «асаблівыя пэрспэктывы можа мець», гэта ўжо выхуляе лішні аптымізм і невыстарчальнае веданьне ўмоў сельскае гаспадаркі БССР»... Сьляды прышчэпаўскай ідэалёгіі мы знаходзім і ў пяцігадовым пляне народнай гаспадаркі БССР, выданым пасьля XV зьезду. Так, на старонцы 344 даецца табліца, па якой к канцу пяцігодкі мы будзем мець 417 тысяч гэктараў пад хутарамі і адрубамі з ростам на гадох, пачынаючы з 1929-30 году. Жадаючы ўтаіць гэта шкодніцкае, кулацкае праектаваньне, аўтары яго ў разьделе «Заўважаныя апячаткі» ў канцы кнігі скромна пішуць: «на 344 старонцы замест «хутары і адрубы» чытай «іншыя віды зямляўпарадкаваньня»... Вось якімі «папраўкамі» дапамагаюць гэй грандыёзнай барацьбе за ліквідацыю прышчэпаўшчыны, якая (барацьба) вядзецца КП(б)Б.

Выходным пунктам тэорыі пляваньня шкодніку і пэрспэктыў разьвіцьця народнай гаспадаркі Беларусі зьяўляецца «тэорыя» аграрнага перанасяленьня і рост беспрацоўя ў гарадох БССР. Аграрнае перанасяленьне і беспрацоўе разглядзецца беларускімі Базаравымі пад моцна павялічаньным шкодніцкім кідком. У мэтах зьмяншэньня аграрнага перанасяленьня ў сельска-гаспадарчай сэкцыі Дзяржпляну будаваўся грандыёзны нераснасьнены плян, паводле якога да 1935 году павінна было быць перасялена з Беларусі ў Далькрай да 1 мільёна чалавек, г. зн. 1/3 частка насельніцтва, — вярней амаль уся беднота. Нават паводле пяцігадовага пляну трэба было перасяліць з Беларусі 300 тыс. гаспадарак за пяцігодзьдзе. Усё ўзрастаючае беспрацоўе на думцы шкодніку будзе вісець няжкай гірай на нагах рабочае клясы Беларусі і ўзмоцніцца ў пэрыяд рэканструкцыі — праблема беспрацоўя ня можа быць вырашана ня толькі ў першае пяцігодзьдзе, але нават і ў другую пяцігодку.

Як мізэрны «тэарытычныя» намаганьні гэрою арыфмомэтраў і рахункоўных табліц параўнальна з рэвалюцыйнай сапраўднасьцю, якая да 1931 году ліквідавала беспрацоўе!

Нашы беларускія Базаравы высоўвалі тэорыю фарсаваньня разьвіцьця працаёмкіх галін прамысловасьці на прывозным транспартабельным сырцы (швейная, тэкстыльная, панчошна-трыкатажная), скажаючы пастановы XII зьезду КП(б)Б, тармозячы разьвіцьцё галін вырабу сродкаў вытворства ў БССР, што базуюцца на ўласным сырцы і сваіх энэргетычных рэсурсах (торф, дрэва-апрацоўчая прамысловасьць, хэмічная і г. д.), вядучы курс на пагасаючую крыўую тэмпу разьвіцьця гэтых галін і зьмяншэньне іх удзельнай вагі ў прамысловасьці Беларусі. Так будаваўся грандыёзны шкодніцкі плян разь

ЗАКАНТРАКТАВАЦЬ УСЕ СВАЕ ЯРАВЫЯ ПАСЕВЫ

ПАСТАНАВІЛІ: КАЛГАС „ТРАКТАР“, КАЛГАСЬНІКІ, БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ м-ка ЛЕНІНА Ў СЛУЧЧЫНЕ

Падрыхтаваць цягавую сілу да вясны. Руйнуючы ўдар па кулаку, які агітуе за разбазарваньне коняй. Самая рашучая барацьба з апартуністамі, якія тармозяць абагульваньне цягавай сілы ў калгасах

На барацьбу за 25 тысяч гэкт.

АШУЧА УДАРЫЦЬ ПА АПАРТУНІСТЫЧНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ І САМАЦЕКУ Ў СПРАВЕ ЗАГАТОВАК НА СЕНЬНЯ ГАРОДНЫХ КУЛЬТУР.

Падрыхтоўка да гародняй сяўбы праходзіць адчэпна марудна. Каб своячасова распачаць сяўбу, загатоўкі агародняга насеньня павінны быць скончаны ў лютым месяцы. У сакавіку ўсё насеньне павінна быць разьмеркавана паміж прыгароднымі гаспадаркамі.

Між тым, загатоўкі насеньня праходзяць такімі тэмпамі, якія не забясьпечваюць своячасовага пачатку сяўбы.

На 1-га лютага сыстэмай спажывецкай кааперацыі загатоўлена насеньня: гурко́ў—1 проц., цыбулі—2,7 проц., морквы—4,2 проц., буракоў—8,6 проц., капусты—9,6 проц., часныку—0,07 проц. і г. д.

У большасьці раёнаў заданьне па загатоўках не даведзена да кулацка-заможнага двара. Раённыя арганізацыі не аддаюць загатоўкам насеньня належнай увагі.

Упердзе — Бабруйскі раён. Бабруйскае раённае спажыв. таварыства высунула сустрэчны плян загатовак, павялічыўшы на 200 проц. усе віды загатовак насеньня, і ўжо набліжаецца да яго выкананьня. Таварыства выклікала на сацспаборніцтва спажывецкія таварыствы Глуску, Гомелю, Любані.

Рад раёнаў яшчэ не прыступілі да загатовак. Сюды адносяцца: Веткаўскае, Жлобінскае, Камароўскае, Буда-Кашалёўскае, Уваравіцкае, Цэрахаўскае, Юраўцкае і Парыцкае спаж. таварыствы. А Лельчыцкі раён, не прыступіўшы нават да загатовак, не разгарнуўшы масавай работы, ужо піша... «пляны нерэальныя, насеньня ў раёне няма».

Адзін з самых насеннаводных раёнаў—Старобінскі — на 1-га лютага не загатовіў ні аднаго кілё насеньня.

Па большасьці крам адсутнічаюць расцэнкі на насеньне і інструкцыі, як праводзіць загатоўкі.

Праўленьне Белкавпасаюзу на апошнім пасяджэньні пастанавіла прыцягнуць да судовай адказнасьці праўленьне Старобінскага раённага спаж. таварыства за невыкананьне дырэктыў па загатоўках насеньня. Слушнаму таварыству абвешчана суровая вымова.

Загатоўкі насеньня гародных культур зьяўляюцца зараз асноўным зьвяном падрыхтоўкі прыгарадных гаспадарак да сяўбы. Усе арганізацыі павінны максымум увагі аддаць гэтай справе, каб дабіцца 100 проц. выкананьня пляну загатовак.

Дырэктыва ЦК аб засеве 25 тыс. гэкт. у прыгарадных гаспадарках павінна быць выкананa.

Апартуністыя працягваюць сваю падрыўную работу

ГАРАДОК, 3 лютага.

«Левыя» загібы мінулага году ў ГАРАДОЦКІМ раёне (у часе «гапавакружэньня ад посьпехаў» раён калектывізаваўся на... 100,6 проц.) у бягучым годзе перарасьлі ў апартуністычную пасыўнасьць, у права-апартуністычную стаўку на самацёк.

За яўны правы апартунізм у галіне загатовак і праведзеньня асеньняй сяўбы кіраўніцтва Гарадоцкага раёну было зьнята. Але ў некаторых раённых установах засталіся яшчэ апартуністы, якія перашкаджаюць раённай арганізацыі пабаявому перабудаваць сваю работу і мабілізаваць бядняцка-серадняцкія масы, накіраваць іх працоўны энтузіязм на выкананьне задач другой калгаснай вясны.

Апартуністычная практыка ў рабоце раду ўстаноў усё яшчэ перашкаджае новаму кіраўніцтву раёну як можна хутчэй перастроіць рады партарганізацыі для далейшага разгортваньня калгаснага руху, для ўмацаваньня існуючых калгасаў.

Вось факты. На сёнешні дзень пасеўныя пляны, на гледзячы на неаднаразовыя дырэктывы партыі і ўраду, не даведзены ні да калгасаў, ні да вёсак. Райземаддзел і райкалгассаюз парушалі тэрміны, вызначаныя ўрадам. Зараз імі ў чацьверты раз вызначан тэрмін давядзеньня плянаў да калгасу і двара — 20 лютага.

Ня гледзячы на тое, што ў большасьці калгасаў яшчэ ня скончана малацьба, 38 ТРАКТАРАЎ МТС І 5 СКЛАДАНЫХ МАЛАТАРАНЬ НЕ СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ДЛЯ АРГАНІЗАЦЫІ МАЛАЦЬБЫ Ў КАЛГАСАХ І СТАЯЦЬ БЯЗ РУХУ.

Апартуністычная бязьдзейнасьць райгандлю прывяла да таго, што ў Гарадоцкім ільнаводчым раёне дагэтуль яшчэ ня створаны насенныя фонды. Весткі, якія паступаюць ў цэнтр аб стварэньні насенных фондаў ільну ў размеры 32 проц., не адпавядаюць сапраўднасьці, бо ільняное семя перадана на завод для перапрацоўкі.

Цьвёрдыя заданьні хаця і даведзены да кулацкіх гаспадарак, але ня выконваюцца, бо кулакі маюць добрага абаронцу ў асобе загадчыка райгандлю Іціксона, які зусім іх ня трывожыць. На сёнешні дзень ў Гарадоцкім РВК няма ніякіх вестак аб выкананьні цьвёрдых заданьняў па ўсіх відах загатовак. Спадзяюцца, што кулакі самі паведамляць, калі яны выканаюць цьвёрдыя заданьні.

У РАЁНЕ ЁСЬЦЬ УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ КАЛГАСНАГА РУХУ. Машына-трактарная станцыя, якая зараз арганізавана, — вось база, на якой з посьпехам можа разгортацца суцэльная калектывізацыя раёну і на яе аснове ліквідацыя кулацтва, як класы. Сярод бядняцка-серадняцкіх мас раёну назіраецца вялікае імкненьне да ўступленьня на выпрабаны шлях калгасаў, ёсьць у наяўнасьці калгасны ўздым.

Але апартуністы, якія яшчэ працуюць у некаторых раённых арганізацыях, перашкаджаюць разгортваньню масавай растлумачальнай работы сярод беднякоў і сераднякоў, перашкаджаюць умацаваньню старых калгасаў, выконваючы заказ кулака. Толькі гэтым можна тлумачыць павольныя тэмпы калектывізацыі ў раёне.

Вось факты. З 39-ці калгасаў раёну ні ў адным дагэтуль ня скончана разьмеркаваньне ўраджаю. Апартуністы з райкалгассаюзу і з раду праўленьняў калгасаў не жадаюць разумець таго, што разьмеркаваньне ўраджаю зьяўляецца адным з галоўнейшых фактараў для далейшага росту калектывізацыі, для арганізацыі новага магутнага калгаснага прыліву.

У большасьці калгасаў калгаснікі атрымліваюць авансы. Ніхто ня ведае, хто колькі зарабіў за год. Таму кожны калгаснік імкнецца набрать як можна больш авансаў. Спажывецкія настроі характэрны для большасьці калгасаў раёну.

Калі мы спыталіся ў старшыні райкалгассэкцыі МЕДЗНЭКА, чым ён тлумачыць адсутнасьць работы па разьмеркаваньні ўраджаю, дык атрымалі наступны адказ:

— Па-першае, з-за адсутнасьці бухгальтароў у калгасах, а па-другое, самі калгаснікі не зацікаўлены разьмеркаваньнем ўраджаю.

Такое тлумачэньне мог даць чалавек, які страціў партыйны твар. У РАЁНЕ ЎСЁ ЯШЧЭ ІСНУЕ ЗЛОСНЫ САМАЦЁК У СПРАВЕ АРГАНІЗАЦЫІ НОВАГА ПРЫЛІВУ. НІ Ў АДНЫМ З КАЛГАСАЎ НЯМА ВЯРБОВАЧНЫХ КАМІСІЙ. НІДЗЕ НЯ СТВОРАНЫ ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ГРУПЫ.

Становішча з кармамі ў раёне з кожным днём пагаршаецца. Нічога ня робіцца для стварэньня кармавых фондаў на час весьнавой сяўбы. Сярод некаторай часткі калгаснікаў пад уплывам кулацкай агітацыі заўважваюцца наплывацельскія адносіны да коннай цягавай сілы і да стварэньня кармавых фондаў. Вось з гэтай кулацкай агітацыяй, са спробамі затрымаць дапейшае разьвіцьцё калектывізацыі ў раёне не вядзецца рашучай барацьбы.

Якія-ж задачы ў сувязі з гэтым зараз паўстаюць перад Гарадоцкай раённай арганізацыяй?

Трэба з усёй бальшавіцкай рашучасьцю выгнаць з раённых устаноў правых і «левых» апартуністаў, бязьлітасна выкарчаваць рэшткі апартунізму, якія праяўляюцца на практыцы работы раду раённых устаноў. Трэба моцна ўдарыць па самацёку ў справе арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Масавай растлумачальнай работай сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, актыўнай дапамогай машына-трактарнай станцыі ў справе заключэньня дагавораў з калгасамі і вёскамі, ездарэньнем праўленьняў раду калгасаў,ачышчэньнем іх ад кулацкіх і апартуністычных элемэнтаў, раённыя арганізацыі здолеюць зрушыць наперад ажыцьцяўленьне задач другой бальшавіцкай вясны, задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Брыгада «Зьвязды»:
ГАРБАЧОЎ, ФАРБЭРАЎ.

Падрыхтаваць каня да вясны

Спыніць разбазарваньне цягавай сілы

Своячасовая падрыхтоўка цягавай сілы зьяўляецца адной з важнейшых умоў пасьпяховага правядзеньня падыходзячай весьнавой сяўбы.

Між тым весткі з месц гавораць, што ў радзе калгасаў справа з падрыхтоўкай цягавай сілы стаіць ня вусім добра.

Першае, што трэба падкрэсьліць, гэта тое, што абагульваньне цягавай сілы ў калгасах значна адстае ад росту калектывізаваных гаспадарак.

Так, на 30-га верасьня 1930 г. на 91.320 аграмаджаных гаспадарак прыпадала 85.272 абагуленых коняй. На 20-га студзеня 1931 г. на 119.644 аграмаджаныя гаспадаркі мы маем 69,442 абагуленых коняй.

Жорсткая клясавая барацьба, якая зараз адбываецца ў вёсцы ў сувязі з далейшым ростам калгаснага будаўніцтва, супраціўленьне і шалёная агітацыя кулацтва, імкненьне яго затармазіць сацыялістычнае будаўніцтва—вось асноўныя прычыны разбазарваньня цягавай сілы і марудныя тэмпы абагульваньня коняй.

Кулацтва вядзе шалёную агітацыю за зьнішчэньне цягавай сілы ў калгасах у надзеі, што гэтым яму ўдасца затрымаць далейшы рост калгаснага руху.

У некаторых раёнах гэтай кулацкай агітацыі не паносіцца руйнуючы ўдар. Так, у Межынскім раёне ў верасьні 1930 г. на 461 калектывізаваную гаспадарку прыпадаў 331 рабочы конь, а на 10-га студзеня 1931 г. на 462 калектыўныя гаспадаркі засталося 280 коняй.

Пухавіцкі раён у 1930 г. па 1.256 аграмаджаных гаспадарак меў 1.063 абагуленых коняй. На 10-га студзеня 1931 г. у раёне па 1331 аграмаджаную гаспадарку прыпадае 896 абагуленых коняй.

Партыйныя і ўрадавыя органы своячасова далі дырэктывы аб падрыхтоўцы цягавай сілы да весьнавой сяўбы, між тым, у радзе калгасаў пад уплывам кулацкай агітацыі ёсьць тэндэнцыі да скарачэньня цягавай сілы: «моў, навошта нам коні, калі нам дадуць трактары»—так разважаюць у некаторых калгасах.

Вось з такімі настроямі, з кулацкай агітацыяй за зьнішчэньне цягавай сілы трэба павесьці бязьлітасную барацьбу. Неабходна дабіцца, каб тэмпы аграмаджаньня цягавай сілы не адставалі ад тэмпаў калектывізацыі, трэба жорстка караць за разбазарваньне і зьнішчэньне цягавай сілы.

Стварэньне кармавых фондаў на час весьнавой сяўбы зьяўляецца зараз важнейшай задачай кожнага калгасу і саўгаспу. Максімум увагі да калгаснага і саўгаснага каня.

ГРУЗАКОЎ.

Шэфу Бягомльскага раёну— Беларускаму камітэту саюзу харчавікоў

У мінулым годзе саюз харчавікоў узяў шэфства над Бягомльскім раёнам, які зьяўляецца як эканамічна, так і культурна адсталым. Харчавікі шмат дапамаглі раённым арганізацыям напярэдадні і ў часе весьнавой сяўбы 1930 году. Прысылка рабочых брыгад, кузьні, майстэрні, трыеры, правядзеньне масавай растлумачальнай работы аб калектывізацыі, — усё гэта спрыяла пасьпяховаму правядзеньню весьнавой сяўбы і узмацненьню калектывізацыі раёну.

Зараз 40 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Бягомльскага раёну ўжо аб'ядналіся ў калгасы. Ёсьць сельсаветы, дзе процант калектывізацыі дасягае 45. Толькі ў ленінскія дні ў калгасы ўступіла каля 700 гаспадарак.

Трэба лічыць, што саюз харчавікоў узяў шэфства над Бягомльшчынай ня толькі на адзін год. Мы чакаем, што і зараз, па прыкладзе мінулага году, саюз харчавікоў зноў арганізуе рабочыя ўдарныя брыгады і пашле іх у Бягомльшчыну для дапамогі ў падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны, для дапамогі ў правядзеньні суцэльнай калектывізацыі і па яе аснове ліквідацыі кулацтва як класы.

Мы спадзяемся, што саюз харчавікоў адначасова вылучыць лепшых ударнікаў, якія б засталіся ў раёне па пастаянную работу, бо ў нас адчуваецца недахват кадраў.

У заключэньне хачу паведаміць аб вельмі добрым пачынаньні барысаўскай раённай газэты «Бальшавік Барысаўшчыны». Яна вызначыла прэмію—трактар — лепшаму калгасу за ўзорную арганізацыю працы ў калгасе, за лепшае правядзеньне другой бальшавіцкай сяўбы. Газэта ўжо сабрала шмат сродкаў на гэту мэту.

Мы лічым, што гэтае пачынаньне трэба было-б з вашай дапамогай правесьці і ў Бягомльшчыне. Гэта спрыяла-б узмацненьню тэмпаў калектывізацыі і паляпшэньню работы калгасаў у раёне.

Чакаем хуткага вырашэньня гэтага пытаньня і адказу.

З калгасным прывітаньнем.

Селькор ВІКТАР ШЫМАКОЎСКІ.

Пляны ў папках сельсавету

Падрыхтоўка да весьнавой сяўбы па Пудацкім сельсавеце, Сураскага раёну, яшчэ не пачыналася. Пляны весьнавой сяўбы не даведзены ні да калгасу, ні да вёскі і спакойна ляжаць у папках сельсавету.

Ачыстка насеньня таксама не пачата. Трыеры не адрамантаваны. Майстэрні для рамонту інвэнтару як у калгасах, так і ў адпаасобным сэктары не прыстасаваны.

Парт'ячэйка і сельсавет праяўляюць апартуністычную бязьдзейнасьць. Яны нічога ня робяць для арганізацыі масавага прыліву ў калгасы, для ўмацаваньня існуючых калгасаў і падрыхтоўкі іх да правядзеньня сяўбы.

СЕЛЬКОР.

Бабруйскі райза блукае ў поцемках

Райземаддзел — штаб кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем другой бальшавіцкай вясны. Але гэтага нельга ў поўнай ступені сказаць аб Бабруйскім райземаддзеле.

Рабкораўская брыгада гэтымі днямі зрабіла праверку, як райза кіруе падрыхтоўкай да сяўбы.

— Як у вас са аборам насенных фондаў і з рамонтам інвэнарту?—запыталіся брыгадзіры.

— Поўна сказаць ня можам, вестак няма, — вось адказ.

— Як-жа вы складаеце па-дэкадныя зводкі?

— Ды так, па «прыблізных» падліках.

Інакш кажучы, райземаддзел блукае ў поцемках, нічога ня ведаючы аб сапраўдным стане падрыхтоўкі да сяўбы. Зразумела, аб кіраўніцтве калектывізацыяй, стварэньні насенных фондаў, рамонце інвэнтару і г. д. пры такой рабоце ня можа быць і гутаркі.

Але гэтага мала. Чыноўнікі з райза, складаючы зводкі, бяруць лічбы са столі і ашукваюць вышэйшыя партыйныя і ўрадавыя органы.

Шмат часу прайшло ўжо з дня апублікаваньня адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі. Але работнікі райземаддзелу нічога не зрабілі для папулярызацыі гэтага важнейшага гістарычнага дакумэнту сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Броскі сельсавет паказаў прыклад узорнай работы па падрыхтоўцы да другой калгаснай вясны. Райземаддзел нічога не зрабіў, каб вызначыць гэты прыклад і распаўсюдзіць яго на іншыя сельсаветы. Справаздачна - перавыбарчая кампанія ў калгасах не ператворана ў сапраўдную масава - палітычную кампанію. У гэтым таксама немалая віна райземаддзелу.

Вывад адзін: райземаддзел павінен без адкладна перабудаваць па-баявому сваю работу, стаць сапраўдным кіраўніком калгаснага руху ў раёне, мабілізаваўшы вакол важнейшых задач падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы, вакол ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду аб кантрактацыі шырокія бядняцка - серадняцкія масы вёскі.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ».

Парадак кантрактацыі яравых

Да 1-га красавіка павінна быць праведзена ўся работа па кантрактацыі

Паркамгандлю БССР распрацаваў інструкцыю аб парадку кантрактацыі яравых, абожжавых і тэхнічных культур, бульбы, садавіны і гародніны ў 1931 годзе.

Кантрактацыя праводзіцца ў калгасах, вытворчых аб'яднаньнях і групах насеўшчыкаў. Па садавіне кантрактацыя дапускаецца таксама і па асобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Раённыя кампаніі пляны кантрактацыі праводзяць да асобных сельсаветаў і калгасаў. Сельсаветы разьмяркоўваюць пляны кантрактацыі па асобных населіўных.

Для дапамогі кантрактуючым арганізацыям у кожным сельсавеце арганізуюцца спэцыяльныя камісіі садзейнасьці кантрактацыі, у якія ўваходзяць прадстаўнікі ад бядняцка - батрацкіх груп сельсаветаў і казнактыву.

Калгасы і бядняцка - серадняцкія гаспадаркі, якія закантрактавалі свае пасевы, атрымліваюць права першачарговай куплі дэфіцытных прамтавараў (мануфактура, гатовае адзеньне, абутак, скура, махорка і г. д.), па вызначаных таўных дзяржаўных цэнах.

Тэрмін скончэньня правядзеньня кантрактацыі ўстанаўляецца — 1-га красавіка 1931 году.

Правядзеньне кантрактацыі яравых культур пасеву 1931 г. ускладаецца на Белільнасаюз і Белсадсаюз. Пасеўшчыкі павінны здаць 30 проц. закантрактаванай прадукцыі 30 верасьня і 70 процантаў — 30 лістапада.

Кантрактацыя тэхнічных культур праводзіцца Белільнасаюзам. У раёнах, дзе няма сыстэмы Белільнасаюзу, кантрактацыя праводзіцца сыстэмай с.-г. кааперацыі пад кіраўніцтвам Белільнасаюзу.

Апрача гэтага, у раёнах дзейнасьці МТС кантрактацыя праводзіцца Трактарацэнтрам пры заключэньні дагавораў МТС з насельніцтвам.

Ужо распрацаваны інструкцыі аб парадку аванса ваньня і крэдытаваньня кантрактацыі, а таксама аб парадку набесьпячэньня кантрактантаў таварамі.

„Нашым водгукам на адозву павінна быць уступленьне ў калгасы“

СЛУЦАК. (Па тэл. ад паш. кар.). Члены калгасу «Трактар», Кастрычніцкага сельсавету, заслухаўшы па сваім сходзе адозву СНК і ЦК аб кантрактацыі яравых 1931 г., з вялікім здавальненьнем адзначаюць тыя вялізарнейшыя мерапрыемствы савецкага ўраду і камуністычнай партыі, якія накіраваны па разьвіцьцё сельскай гаспадаркі і якія ў сапраўднасьці сьведчаць аб пераможным сацыялістычным будаўніцтве.

«У адказ на заклік савецкага ўраду і кампартыі,—гаворыцца ў рэзалюцыі сходу,—мы абяцаем пасеяць ільну 10 гэктараў, капапель 1½ гэкт., бульбы 100, кораніплодаў 9, кукурузы 6 і кармавых траў 142 гэктары. Выкананьне гэтай праграмы забясьпечвае вырашэньне ўскладзенай на нас задачы па разьвіцьці жывёлагадоўлі і забесьпячэньні прамысловасьці тэхнічнымі культурамі. Мы даручаем праўленьню нашага калгасу закантрактаваць усе тэхнічныя культуры, а таксама і іншыя культуры, якія вызначаны нам паводле пляну. Абавязуемся ўпарта працаваць па ўмацаваньні нашага калгасу і арганізацыі новага магутнага калгаснага прыліву. Мы арганізуем ініцыятыўныя вярбовачныя групы ў сельсавеце з перадавых актыўных калгаснікаў Тарадовіча, Паўлюка, Бруя Алеся, Кулешка і г. д.

Адначасова мы зварачаемся да ўсіх беднякоў, сераднякоў нашага раёну абмеркаваць адозву і вялізарныя мерапрыемствы, што вызначаюцца партыяй і ўрадам—завоз трактараў, с.-г. машын, пазыкі і г. д., якія накіроўваюцца па вызваленьне нас, беднякоў і сераднякоў, ад галечы і цёмры, ад кулацкай кабалы, на ўмацаваньне нашай пралетарскай краіны.

Нашым першым водгукам на адозву савецкага ўраду і кампартыі павінна быць уступленьне ў калгасы. Толькі шлях калектывізацыі дасьць нам магчымасьць дастасаваць у сельскай гаспадарцы перадавую тэхніку, буйныя с.-г. машыны, узьняць па вышэйшую ступень разьвіцьцё нашай сельскай гаспадаркі, аблегчыць нашу работу і ўзьняць свой дабрабыт».

У адказ на адозву ЦК аб кантрактацыі калгаснікі, беднякі і сераднякі мястэчка Леніна, Слуцкага раёну, на сходзе прынялі пастанову, у якой абавязуюцца выкапаць поўнасьцю плян весьнавой сяўбы на плошчы 833 гэктары, пашырыць плошчу тэхнічных культур і кораніплодаў і поўнасьцю закантрактаваць яравыя пасевы.

ГРАХНЕЎ.

Коняводзтвам ніхто ня кіруе

Гэтымі днямі НКЗем Саюзу ССР пастанавіў арганізаваць саюзнае кіраўніцтва каняводзтвам і прапанаваў усім саюзным рэспублікам стварыць такія кіраўніцтвы пры НКЗ рэспублік.

Падаўна (з вялікім спазьненьнем) НКЗБел пастанавіў правесьці рад важнейшых і буйных закадаў у галіне коняводзтва і каняпаляшэньня.

Гэтыя мерапрыемствы больш чым на 50 проц. павінны быць праведзены да наступленьня злучнай кампаніі і ў часе яе, г. зн. галоўным чынам за час да 1-га мая.

Гэты пэрыяд у каняводзтва—выключна важны. Калі ён прапушчан—цэлы год прападзе дарма.

Значыцца, іменна цяпер безадкладна НКЗБел павінен перабудаваць работу па каняводзтве.

Трэба адзначыць, што ніякага кіруючага органу справай каняводзтва ў нас ня было.

Каняводзтва ўвесь час было пасынкам НКЗБел. На каняводзтва не зварачалася ўвагі. Аб гэтым сьведчаць пляны і справаздачы НКЗ за мінулыя гады.

Для таго, каб каняводзтва правільна разьвівалася неабходна правільнае, моцнае, аўтарытэтнае кіраўніцтва.

Якжа стаіць справа цяпер?

Наркамзем, кіруючы і плянуючы орган, цалкам адказны за тое, каб сацыялістычная гаспадарка нашай краіны мела патрэбную колькасьць коняй, цалкам адказны за тое, каб наша Чырвоная армія, Чырвоная конніца мела-б стандартнага высакаякаснага каня,—мае толькі аднаго спэцыяліста, які ўваходзіць у склад сэктару жывёлагадоўлі і гэтарнарыі. Гэты спэцыяліст бязьнадзейна сядзіць у сьценах НКЗ, закапаўшыся ў паперах. Ён ня можа справіцца з практычнай работай, а практычным кіраўніцтвам каняводзтвам Беларусі.

Калгасная сыстэма, дзяржаўны сэктар сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўчая кааперацыя, дарожна-будаўнічыя органы, лесазагатоўшчыкі, спажывецкая кааперацыя, работу ўсіх іх пясьнейшым чынам зьвязана з конскай цягавай сілай, г. зн. з каняводзтвам. Далей ідуць Саюзмяса, Саюзскура і іншыя загатоўшчыкі прадуктаў каняводзтва.

Кіраўніцтва работай усіх гэтых устаноў павінна быць сканцэнтравана ў НКЗ. Усе гэтыя ўстановы вядуць работу, так ці інакш зьвязаную з каняводзтвам у самых розных напрамках. Нярэдка іх інтарэсы проста процілеглы адны другім.

Кіраваць работай усіх устаноў па усіх напрамках, увязваючы яе і накіроўваючы па адным рачышчы, ня можа адзін чалавек, ня могуць і два чалавекі, якія закапаліся ў паперах.

Са ўсіх паказаных устаноў толькі дзьве маюць ці мелі чалавека, які загадвае пытаньнямі каняводзтва—Калгасцэнтр і Белмаляжывёласаюз.

Але...

Калгасцэнтр мае спэцыяліста, які адначасова з каняводзтвам загружан і другой работай, а ў Белмаляжывёласаюзе быў да апошняга часу толькі апэрацыйны работнік. Работніка выторчасьці, тэхніка ня было і няма, а нават і апэрацыйнік гэтымі днямі паехаў на вучобу.

Цэнтральны кіруючы орган па каняводзтве зусім неабходны. Наколт гэтага ёсьць зусім акрэсьленая пастанова і Саюзнага НКЗ.

І ўсё-ж НКЗБ аб стварэньні такога органу ня хоча думаць.

30-та студзеня калегія НКЗему разглядала новыя штаты. Адзінае, на што найшла калегія ў справе каняводзтва, гэта на ўвядзеньне ў штат сэктару жывёлагадоўлі і ветэрынарыі яшчэ аднаго (другога) спэцыяліста па каняводзтве. Кажучы другімі словамі, калегія пытаньня змазала. Два чалавекі ў сучасных умовах работы нічога ня зробяць, ня могуць зрабіць; яны таксама будуць заваленыя паперамі, таксама будуць сядзець у 4-х сьценах, як да гэтага часу сядзіць адзін спэцыяліст.

Таксама, як і да гэтага часу, справа конскай цягавай сілы, справа каняводзтва застаецца без кіраўніцтва.

Адзіны выхад з гэтага становішча—гэта арганізацыя сапраўднага кіраўніцтва з патрабным штатам.

НКЗБел. павінен сваю пастанову перагледзець безадкладна.

Кіраўніцтва каняводзтвам павінна быць створана.

М. ТАРАРУЬ.

Газэта „Чырвоны шлях“—арганізатар калгаснага прыліву

СЛУЦАК. (Па тэл. ад наш. спэц. кар.). Слуцкі раён, гэтая жытніца Беларусі, павінен асабліва энэргічна, па-баявому рыхтавацца да вясны. Аднак, гэтых баявых тэмпаў падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны на Случчыне няма.

Здавальняюча ідзе толькі ссыпка насенных фондаў у калгасах — заданьне выканана на 60 проц. Зусім не правядзіцца засыпка страхавых фондаў і ачыстка па лініі камітэту сялянскай узаемадапамогі.

На здымку ўдарная брыгада саўгасу Тарасава.

Пасеўныя пляны даведзены да кожнага калгасу і 75 проц. кулацкіх і заможных гаспадарак. Усе калгасы абмеркавалі і прынялі вызначаныя заданьні, а некаторыя высунулі сустрэчныя пляны, якія на многа перавышаюць пляны райкалгассаюзу.

Толькі здзін нацыянальны ЯЎРЭЙСКІ КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» упарта адмаўляецца пашыраць пасеўную плошчу за кошт узворваньня новых зямель. Сакрэт вельмі просты. Гэта калгас у адзнаку АД 7-МІ ІНШЫХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ЯЎРЭЙСКІХ КАЛГАСАЎ, зьяўляецца вузка замкнутым і не вядзе кіякай барацьбы за прыліў. Калгаснікі «Чырвонага Кастрычніка» выступаюць супрэць пашырэньня вытворчай праграмы, спажывецкія тэндэнцыяны ставяць вышэй за ўсё, самі яны ня хочуць працаваць.

Для папулярызацыі адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі ў калгасах і сярод адна асобнікаў з раёну накіраваны па 3 чалавекі кожны сельсавет.

ВЯЛІКУЮ РАБОТУ ПРАВОДЗІЦЬ РАЕННАЯ ГАЗЭТА «ЧЫРВОНЫ ШЛЯХ». ГАЗЭТА АРГАНІЗАВАЛА 8 СЕЛЬКОРАЎСКІХ БРЫГАД, у задачы якіх пастаўлена папулярызацыя адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі і канкрэтная дапамога калгасам у падрыхтоўцы да вясны. АРГАНІЗАВАНЫ ТАКСАМА 3 ВЯРБОВАЧНЫЯ БРЫГАДЫ З АДНААСОБНІКАЎ. ДЗЯКУЮЧЫ РАБОЦЕ СЕЛЬКОРАЎСКІХ БРЫГАД, гэтымі днямі АРГАНІЗАВАЎСЯ НОВЫ КАЛГАС. Селькораўскія брыгады ня толькі агітуюць словамі, але і справамі. КАЛГАСЫ «ПРАГРЭС» І ІМЯ КАРЛА МАРКСА ПОЎНАСЬЦЮ ПРАВЯЛІ АЧЫСТКУ НАСЕНЬНЯ.

Рамонт с.-г. інвэнтару праходзіць у раёне чарапашым тэмпам. У калгасах рамонт выканан на 1/5. Браніраваныя кармавыя фонды створаны толькі ў старых калгасах, і то далёка няпоўнасьцю. Некаторыя калгасы адмаўляюцца ствараць іх, гаворачы, «будзе норм— будзем нарміць».

ГРАХНЕЎ.

КРАІНА будзе пісьменнай!

ПЛЯНЫ ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці выканаць

У „дэкаду штурму“ па-бальшавіцку перабудуем сваю работу ў кірунку якаснага паляпшэньня навучальнай і выхаваўчай работы ў школе

НА ШТУРМ!

XVI зьезд УсеКП(б) адзначыў, што «правядзеньне абавязковага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці павінна стаць баявой задачай партыі ў бліжайшы пэрыяд». Між тым, якраз у ліквідацыі няпісьменнасьці гэтай «баявой задачы» у нас ёсьць рад прарываў.

Так, ня поўнасьцю ахоплены школаю дзеці 8-10 год і асабліва — пераросткі, дзеці неадавальняюча забясьпечваюцца тарачным сьпеданьнем, адзеньнем, вопраткай. Лікпунктамі недастаткова ахоплены ў першую чаргу рабочыя, сельгаслесарбочы, батракі, калгаснікі, дапрыцэнтніцкі, нерамесьнікі і вясковы актыў. Невыстарчальна абслугоўваецца школамі і лікпунктамі працоўная нацменшасьцяй.

Выходзячы з гэтага, Наркамасьветы і ЦП саюзу працасьветы зьвярнуліся са спэцыяльнай адозвай да ўсіх асьветнікаў БССР. У гэтай адозве асьветнікі заклікаюцца на штурм прарываў у галіне ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці. «Дэкада штурму» абвешчана з 1 па 10 лютага.

— Бязьлітаснае змаганьне з клясава-варожымі элемэнтамі, зрыўшчыкамі ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці, — гаворыцца ў гэтай адозве, — узмацненьне клясава-інтэрнацыянальнага выхаваньня ў школах, злучэньне тэарэтычнага навучаньня з вытворчай працай, актывізацыя метадаў выкладаньня, плянавасьць у рабоце, зьнішчэньне другагодніцтва і непасьпяховасьці, зьнішчэньне адсеву вучняў, узмацненьне вучнёўскіх самакіраваньняў—усё гэта павінна быць баявымі задачамі асьветнікаў у даны пэрыяд.

Але мінуў тыдзень — і нельга сказаць, каб уся маса асьветнікаў Савецкай Беларусі, пры актыўнай дапамозе і кіраўніцтве партарганізацый, узьнялася на штурм....

Наадварот, у Горацкім, Сураскім раёнах, як паведамляе «Зьвязда», мы ня маем ніякага зруху, ніякага паляпшэньня гэтае адказнейшае справы.

Навучаньне і ліквідацыя няпісьменнасьці ідуць у большасьці па старымцы. Мясцовыя арганізацыі праяўляюць апартуністычную недацэнку пытаньняў забясьпячэньня школ і настаўнікаў прадуктамі першай патрэбнасьці, апалам, газам і г. д.

Такое становішча ня можа быць цярпіма надалей.

Часу засталося мала.

Трэба кінуць сапраўды ўсе сілы на выкананьне пастаўленых партыяй задач усеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Трэба бязьлітасна ўдарыць па стаўцы на самацёк, па зрыве важнейшых дырэктыў партыйных зьездаў.

«Дэкаду штурму» — правесьці па-бальшавіцку!

Становішча пагражаючае...

Аб становішчы ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці і палітэхнізацыі школ у Сураскім раёне пісалася ня раз. Як стаіць справа зараз? Вельмі дрэнна, як і раней...

Па асобных сельсаветах дзеці ахоплены школаю толькі на 70 проц. (Пышнянскі сельсавет). Большасьць лікпунктаў не працуе. Штаб культэстафэты ніды ня ведае аб гэтым.

Праўленьне спажывецкага таварыства надта дрэнна забясьпечвае асьветнікаў прадуктамі першай патрэбнасьці не жадае прымацоўваць іх да закрытых размеркавальнікаў.

У той час, калі зараз, у зьвязку з правядзімай «дэкадай штурму», настаўнікі павінны кінуць усе свае сілы на ліквідацыю няпісьменнасьці на ўсеагульнае абавязковае навучаньне—ім прыходзіцца ездзіць за 20 клм. у раён за дэпэшэрам мукі.

У галіне палітэхнізацыі школ ня робіцца нічога. Нават, калі саюз працасьветы арганізаваў па школах майстэрні па рамонце абутку, дык і гэты пачын сарваўся, бо РВК не адпусьціў адведнага матар'ялу, хоць ён і быў у яго.

Трэба жорстка ўдарыць на гэтай, бязумоўна, апартуністычнай практыцы ў Суражчыне. Адказным працаўніком раёну трэба, нарэшце, уцяміць усю палітычную важнасьць пасьпяховага правядзеньня ў жыцьцё важнейшага наказу партыі—ўсеагульнага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці і стопроцантнай палітэхнізацыі школ.

РЭЗКІ.

Не мабілізаваліся на „дэкаду“

Культ-асьветныя установы Горацкага раёну не мабілізаваліся на правядзеньне абвешчанай НКА і ЦП саюзу працасьветы «дэкады штурму» прарываў у галіне ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Школы і лікпункты па-ранейшаму забясьпечваюцца з рук вон дрэнна.

Так, на Кацілеўскім сельсавеце, дзе ёсьць 4 двух- камплектовыя і 1 аднакамплектовая школы, ніводная з іх не забясьпечана ні апаламі, ні падручнікамі.

У Будзкай, Задаро

Капітулянцкай стаўцы на самацёк, праваапартуністычнай практыцы —

БЯЗЬЛІТАСНАЯ ВАЙНА

Бальшавіцкімі тэмпамі рэалізаваць закон аб аднаразовым зборы на культурна-гаспадарчыя патрэбы

ЛІКВІДАВАЦЬ СТУДЗЕНЬСКІЯ ПРАРЫВЫ Ў МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ, ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ЛЮТАЎСКІ ПЛЯН

ТРЫВОЖНЫ СЫГНАЛ

Даныя аб выкананьні пляну мабілізацыі сроднаў за студзень сьведчаць аб недапушчальна слабым разгортваньні гэтай важнейшай кампаніі. СТУДЗЕНЬСКІ ПЛЯН ПА БССР ВЫКАНАН УСЯГО НА 47 ПРОЦ.

Па паасобных сыстэмах і арганізацыях становішча зусім катастрафічнае. Так, уступныя ўзносы ў калгасы спагнаны толькі на 9 проц., паі па малочна-жывёлагадоўчай кааперацыі —на 5,5 проц. (замест 400 тыс. сабрана 22 тыс. руб.), па абавязацельствах Трактарацэнтру—на 4,6 проц. (замест 787 тыс.—36 тыс. руб.), па звароце пазычак крэдытным т-вам—на 49 проц. і г. д.

У той час, калі паасобныя раёны дабіліся значных посьпехаў у мабілізацыі сроднаў, рад раёнаў (АСЬВЕЙСКІ, АЗАРЫЦКІ, ЛОЕЎСКІ, ВУЛЬСКІ, КРУПСКІ і інш.) недапушчальна мацудзяць. Замест шырокага разгортваньня сеткі ашчадкас, адпаведнай агітацыйна-растлумачальнай работы, некаторыя раённыя арганізацыі палец аб палец ня стукнулі, спадзяюцца выключна на самацёк.

Л. Градзянскі.

Пакончыць з праваапартуністычнай стаўкай на самацёк

Выяўленьне кулакоў для індывідуальнага абкладаньня іх с.-г. падаткам у радзе раёнаў БССР ідзе недапушчальна дрэнна. Некаторыя раённыя арганізацыі недаацэньваюць палітычнага значэньня гэтай работы.

Пастанова ўраду БССР ад 31 сьнежня мінулага году выклікала па некаторых раёнах значны зрух у мабілізацыі сроднаў, большасьць-жа раёнаў і да сёнешняга дня не дабілася ніякага перапому. У АСЬВЕЙСКІМ раёне да выданьня пастановы ўраду былі выяўлены ўсяго 3 кулакі, а на сёнешні дзень — толькі 4, у ГАРАДОЦКІМ раёне да выданьня пастановы — 3 кулакі, на сёнешні дзень — 4, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІМ — 4, як да выданьня пастановы, так і на сёнешні дзень, у ЛЯДНЯНСКІМ — таксама бяз зьмен, ЛАГОЙСКІМ — 5 і 6, СЬМІЛАВІЦКІМ — 3 і 6, ЮРАВІЦКІМ — 5 і 8, СЬВІСЛАЦКІМ — 8 і 10, БЯЛЫНІЦКІМ — 3 і 7 і г. д.

Гэтыя лічбы выразна сьведчаць, што раённыя арганізацыі ня выканалі дырэктывы ўраду аб выяўленьні ўсіх кулакоў да 15 студзеня, што яны ня здолелі ўцягнуць у гэту справу батрацтва, калгасьнікаў, групы беднаты, бядняцка-серадняцкі актыў вёскі і намасмольцаў.

Яшчэ горш стаіць справа са спагнаньнем з кулакоў падатку, страхоўкі і самаабкладаньня. Урад БССР катэгарычна прапанаваў райвыканкомам скончыць гэту работу не пазьней 15 студзеня. МІЖ ТЫМ І НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ПАДАТАК І ІНШЫЯ ПЛАЦЯЖЫ З КУЛАКОЎ НЕ СПАГНАНЫ. Апартуністычныя адносіны да гэтай справы зрываюць выкананьне фінансавага пляну. Некаторыя раённыя арганізацыі праяўляюць надзвычайную пітасьць да кулака, ня хочуць з ім сварыцца. Замест таго, каб прыняць жорсткія меры да кулакоў, якія злосна ня выконваюць сваіх абавязацельстваў, раённыя арганізацыі прымірэнча адносяцца да гэтай справы.

Вось лічбы, якія гавораць самі за сябе. БАРЫСАЎСКІ раён спагнаў з кулакоў толькі 2 проц. падатку, ЧЭРЫКАЎСКІ — 2,5 проц., АЗАРЫЦКІ — 3 проц., ПРАПОЙСКІ — 5 проц., АРШАНСКІ — 5 проц., ХОЦІМСКІ — 4 проц., РАСЬНЯНСКІ — 8 проц., ЛЕЛЬЧЫЦКІ — 8 проц., МАЗЫРСКІ — 9 проц., БЯГОМЛЬСКІ — 10 проц., БУШАЦКІ — 13 проц., ШКЛОЎСКІ — 14 проц., ЧАВУСКІ — 15 проц., КОХАНАЎСКІ — 16 проц., РАСОНСКІ — 19 проц. і г. д.

Ёсьць і раёны, якія лічаць за лепшае зусім не паведамляць аб ходзе спагнаньня падатку. Зусім зразумела, што раёны нічога ў гэтым напрамку не зрабілі. Да такіх раёнаў адносяцца КРУГЛЯНСКІ, КАРМЯНСКІ КРЫЧАЎСКІ, БАГУШЭЎСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ, БЯЛЫНІЦКІ, ВУЛЬСКІ і ЧАЧЭРСКІ.

Трэба бязьлітасна ўдарыць па раённых арганізацыях, якія адносяцца прымірэнча да кулака і зрываюць плян спагнаньня падатку. Апартуністычная недаацэнка гэтай важнейшай работы павінна спаткаць руйнуючы адпор.

МІХАСЬ.

Кулацкаму сабатажу— руйнуючы адпор

1-га лютага скончыўся тэрмін спагнаньня з кулакоў аднаразовага збору на гаспадарчае і культурнае будаўніцтва. Аднак, на сёнешні дзень гэта работа амаль і не распачыналася. **Замест належачых з кулакоў звыш 1.300 тыс. руб. аднаразовага збору, на 1 лютага спагнана ўсяго 25 тыс. руб.** Большасьць раёнаў БССР нават не прыступілі да спагнаньня аднаразовага збору. Раённыя арганізацыі спадзяюцца па самацёк і сядзяць злажыўшы рукі, чакаючы, пакуль кулак сам унясе належныя з яго сумы.

Трэба ўжыць меры для ліквідацыі прарыву. **У бліжэйшыя дні павінен быць дасягнут рашучы пералом.**

Да кулакоў, якія злосна не жадаюць унесьці належныя з іх платажы, павінны быць ужыты рэпрэсіўныя меры. Судовыя органы павінны разглядаць справы кулакоў-нядоімшчыкаў бяз усякай чаргі.

Т.

АДКАЗНЫЯ РАБОТНІКІ—НА МАБІЛІЗАЦЫЮ СРОДКАЎ

Сакратарыят ЦК КП(б)Б мабілізаваў 26 адказных работнікаў цэнтральных устаноў на работу па мабілізацыі сроднаў у раёнах у якасьці ўпаўнаважаных ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Падаем сьпіс мабілізаваных таварышоў: **Рабцэвіч** (ЦВК), **Нахільніцкі** і **Лодысеў** (СНК), **Балабанаў, Валасевіч** (ВСНГБ), **Цофін** (Белплодагародніца), **Руманаў** (Скураб'яднаньне), **Галкін** (Белдзяржкіно), **Вініцкі** (Наркамюст), **Сініцкі** (Наркамасьветы), **Сакольчык** (ЦК працы), **Шыфрын** (Вярхоўны суд), **Вострыкаў** (Белдзяржтранс), **Давідовіч** і **Левін** (ЦК РСІ), **Тарасевіч** (МЦРК), **Вайсман** (Тэкстыльсындыкат), **Аиодзін** (Спіртгрэст), **Тамілін** (ЦБ Пралетэстуду), **Юдоўскі** (Белкаапсаюз), **Федарэнчык** (Наркамсабес), **Трахман** (Саюзтранс), **Плятнёў** (ЦП саюзу СГС), **Драбінскі** (ЦП саюзу мэталістаў), **Корф** (Белсамтрамсаюз) і **Ліхадзіеўскі** (Белшчаціна).

Усе пералічаныя таварышы мабілізуюцца на работу ў раёнах да 1-га сакавіка бягучага году.

СУРОВАЯ ВЫМОВА

КІРАЎНІЦТВУ ВУЛЬСКАГА, АЗАРЫЦКАГА І ЛЁЗЬНЕНСКАГА РАЁНАЎ

4 лютага на пасяджэньні надзвычайнай камісіі ЦК КП(б)Б і СНК БССР па мабілізацыі сроднаў былі заслуханы даклады **Вульскага, Лёзьненскага і Азарыцкага** раёнаў аб выкананьні імі сваіх заданьняў. Выявілася, што гэтыя раёны сарвалі выкананьне фінпляну як за асобны квартал, так і за студзень (студзеньскі плян у гэтых раёнах выканан усяго на 20 проц.). Кіруючыя чацьвёркі па мабілізацыі сроднаў у раёнах бязьдзейнічаюць. Арганізацыі не мабілізаваны на выкананьне фінпляну.

Камісія абвясьціла суровую вымову за невыкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР па мабілізацыі сроднаў бюро РК КП(б)Б і прэзыдыумам РВК Вульскага, Азарыцкага і Лёзьненскага раёнаў.

Горадзкі і Чырвонапольскі сельсаветы патуралі клясаваму ворагу

НА ПРАПЯГУ ДВУХ ГОД ГОРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ (ЧЫРВОНАПОЛЬСКАГА РАЁНУ) НЕ ПАЛІЧВАЎ НА ПАПА САМААБКЛАДАНЬНЯ. НА ЗАПЫТАНЬНЕ — ЧАМУ ГЭТА ТАК, СТАРШЫНЯ СЕЛЬСАВЕТУ АДКАЗАЎ: «БАЧЫЦЕ, НЕ ДАГЛЕДЗІЛІ».

ГЭТА НЕ АДЗІНЫ ВЫПАДАК. ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ ПОП ТАКСАМА КАРЫСТАЕЦЦА НАЛЁГКАМІ З БОКУ СЕЛЬСАВЕТУ. ЗАМЕСТ ПАТРЭБНЫХ 174 РУБ. САМАЛАБКЛАДАНЬНЯ ЁН ПЛАЦІЎ 93 РУБ.

І НЯ ДЗІВА, ШТО ГЭТЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ ЦЯГНУЛІСЯ Ў ХВАСЬЦЕ ПА СПАГНАНЬНІ ПАДАТКУ. ІМЕННА ПАТУРАНЬНЕ КУЛАЦТВУ, КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ ПРЫВЯЛО ГЭТЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ ДА ГАНЕБНАГА АДСТАВАНЬНЯ Ў ВЫКАНАНЬНІ ФІНАНСАВАГА ПЛЯНУ.

ЗАРАЗ ПАСЬЛЯ УМЯШАНЬНЯ РКК-РСІ ГЭТЫЯ ПАМЫЛКІ ВЫПРАЎЛЕНЫ. ВІНАВАТЫЯ-Ж У ГЭТЫМ НЯ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

ЯНЫ ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ ПА ЗАСЛУГАХ.

Пляны не даведзены да камсодаў

За першыя дзьве дэкады студзеня ашчадкасы БССР выканалі свой плян мабілізацыі сроднаў па ўкладах на 36,1 проц. і па мэтавых узносах—толькі на 15,3 проц.

Прычыны гэтаму зусім простыя. Ашчадкасы на сёнешні дзень не пераключыліся на баявыя рэйкі. Кантрольныя лічбы па ўкладах нават і да 25 студзеня ня былі даведзены да нізавых камсадаў.

Ня лепшае становішча і з рэалізацыяй укладаў на швэйныя машыны. Плян выканан толькі на 60 проц.

Ствараецца рэальная пагроза невыкананьня ашчадкасамі пляну мабілізацыі сроднаў за студзень месяц. Ня гледзячы на гэта, кіраўніцтва ашчадкасамі яшчэ на сёнешні дзень нічога канкрэтнага не зрабіла ў галіне забесьпячэньня выкананьня плянаў ашчадкасамі.

КРУЦЯЛЁЎ.

Парушаюць грашовы зварот

Рэчыцкая паштовая кантора і ЦРК

Налёт, зроблены РЭЧЫЦКІМІ рабкорамі і «лёгкай кавалерыяй», выкрыў рад злачынных адносін у галіне грашовых зваротаў з боку некаторых рэчыцкіх устаноў. Напрыклад, паштова-тэлеграфная кантора не здала Дзяржбанку ў дзень налёту 2.861 РУБ. Праўленьне ЦРК таксама часта затрымлівае ў сябе грошы. У дзень налёту ЦРК не здала Дзяржбанку 1.125 РУБ. У Палесмэліяземе лічыцца 15.000 РУБ. падсправаздачных грошай.

Час пакончыць з такімі парушэньнямі грашовага звароту.

М. КУЗЬНЕЧНЫ.

Па Савецкай Беларусі

На раённых зьездах саветаў

Тав. Галадзед—на зьезьдзе саветаў Случчыны

СЛУЦАК. (Наш кар.). 5-га лютага адкрыўся VI зьезд саветаў Слуцкага раёну. На зьезд прыехаў старшыня СНК БССР т. ГАЛАДЗЕД.

У ганаровы прэзыдыум выбраны Палітбюро ЦК УсеКП(б)Б і т. т. АНДРЭЕЎ, ГЕЙ, ГАЛАДЗЕД, ЛЕНСКІ (КПП), ТЭЛЬМАН (КПН) і МАКСІМ ГОРКІ. Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), т. т. СТАЛІНУ і ВАРАШЫЛАВУ, ураду БССР і Цэнтральнаму органу КП(б)Б—«ЗЬВЯЗЬДЗЕ».

Калгасы раёну рапартавалі зьезду аб дасягненьнях у выкананьні сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. З рапартам выступіў камандзір №-скай дывізіі, які заявіў: «№-ская дывізія да бою гатова. У баявой падрыхтоўцы, палітычнай вывучцы часьці дывізіі ідуць наперад. У ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ЗЗО ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ БАЯВОЙ ПАДРЫХТОЎКІ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў ПАРТЫЮ, 400—У КАМСАМОЛ. УСЕ ЧАСЬЦІ ДЫВІЗІІ—УДАРНЫЯ».

З дакладам аб рабоце ўраду выступіў старшыня СНК БССР т. ГАЛАДЗЕД, спатканы бурнымі воплескамі усёй залі.

Баявому органу ЦК КП(б)Б—„Зьвязьдзе"

Барацьбіту за генэральную лінію выпрабаваным кіраўніцтвам кампартыі, будуць рашуча змагацца за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за магутны ўдым калгаснага будаўніцтва, за ліквідацыю кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі, за сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце.

Няхай жыве КП(б)Б і яе баявы орган —«Зьвязда»!

Да 10-цігодзьдзя Воцкай аўтаномнай вобласьці

ІЖЭУСК. Прэзыдыуму Выканаўчага Камітэту Воцкай гўтаномнай вобласьці

Прэзыдыум ЦВК БССР вітае працоўных Воцкай аўтаномнай вобласьці з дзесяцігодзьдзем яе існаваньня. За гэты тэрмін Воцкая аўтаномная вобласьць на падставе ленінскага вырашэньня нацыянальнага пытаньня пад кіраўніцтвам кампартыі, пры дапамозе усяго Савецкага Саюзу, дасягнула вялізарных посьпехаў у справе гаспадарчага і нацыянальна-культурнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Працоўныя БССР упэўнены, што Воцкая аўтаномная вобласьць і далей будзе, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у цеснай сувязі з усім Савецкім Саюзам верна і няўхільна ісьці да сацыялізму.

Няхай жыве Воцкая аўтаномная вобласьць!

Няхай жыве Саюз ССР!

Няхай жыве камуністычная партыя!

Старшыня ЦВК БССР ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар ЦВК БССР ХАЦКЕВІЧ.

Безгаспадарчасьць у эвакапрыёмніку

У эвакапрыёмніку НК Аховы здароўя панае агідная безгаспадарчасьць і антысанітарыя. Ванна пацэвана; хворых, якія прыбываюць у прыёмнік, не абмываюць. Пасьцельная бялізна доўгі час не зьмяняецца, палаты не рамантуюцца, сьцены вільготныя. Заразьліва хворыя не ізаляваны ад іншых хворых.

Адміністрацыя прыёмніку «эканоміць» грошы, асигнаваныя на адпраўку хворых дадому. Апошнім, калі яны атрымаюць, не выдаюцца грошы для гэтай мэты.

Абслугоўваючы пэрсанал займаецца самазабесьпячэньнем. Прадукты выдаюцца хворым у паменшанай норме. Для паасобных хворых няма дыетычнага харчаваньня.

НКАховы здароўя амаль зусім не наглядае за работай эвакапрыёмніку.

РСІ павінна зацікавіцца станоўчым прыёмніку і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

Б.

НА САВЕЦКАЕ ДЫРЫЖАБЛЯБУДАЎНІЦТВА

Уносяць і выклікаюць:

— Макарыцкі КСТУ, Пятрыкоўскага раёну, уносяць на пабудову дырыжабля «Правда» 25 руб. і выклікае Сьнядзінскі, Ляіскаўскі, Белкаўскі і рэшту камітэтаў Пятрыкоўскага раёну.

— Рабочыя і служачыя Талачынскага загатоўчага пункту Саюзхлеба уносяць у фонд абароны краіны 48 руб. і выклікаюць Мсьціслаўскі загпункт Саюзхлеба, а таксама супрацоўнікаў Талачынскага РВК і ўсяго раёну.

— Пленум Клічаўскага райвыканкому ўносіць на пабудову дырыжабля «Правда» 17 руб. і выклікае Сьвіслацкі райвыканком пасьледаваць яго прыкладу.

— Каапбюро Дзяржпляну БССР уносіць на пабудову дырыжабля «Правда» 38 р. 27 кап. і выклікае каапбюро ВСНГБ, Наркамгандлю, ЦВК і СНК.

— Падкалектыў і дзіцячы калектыў дзіцячага саду № 23 уносіць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 10 руб. і выклікае дзіцячыя сады МЦРК і дзіцячы сад № 21.

— У адказ інтэрвэнтам і іх агентам беларускім нацыянал-дэмакратам калгасы Аршанскага раёну ўносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў»: калгас «Чырвоны бераг» — 20 руб. «Яднаньне» — 7 р. 50 к. і выклікаюць усе калгасы Аршанскага раёну пасьледаваць іх прыкладу.

У «тыдзень абароны краіны Рубінкаўскі сельсавет сабраў 500 руб. Збор сроднаў працягваецца.

— Рабочыя швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» пастанавілі адпрацаваць дзьве гадзіны ў фонд дырыжаблябудаўніцтва.

— Рабочыя мэханічнага цэху заводу «Энэргія» адпрацоўваюць у гарысьць дырыжаблябудаўніцтва 4 гадзіны.

— Ячэйка Асавіяхіму міліцыі і крымвышуку сабрала 200 рублёў на пабудову дырыжабля. Ячэйка выклікае па сацспаборніцтва ячэйку Асавіяхіму пракуратуры.

— Дзіцячы сад жакту № 1 уносіць у фонд пабудовы дырыжабля «Клім Варашылаў» 33 р. 46 к. і выклікае дзіцячы ачаг № 5.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ:

— **Дом Асьветы.** У 19 гадз.—адкрыты сход парткалектыву КП(б)Б працасьветы. Парадак дня: вынікі пленуму ЦК КП(б)Б. Запрашаюцца асьветнікі г. Менску.

— **Дом Пісьменьніка.** У 19 гадз. склікаецца першы арганізацыйны сход драматургічнай сэкцыі БелАПП'у. Парадак дня: 1) Задачы пралетарскай драматургіі. 2) Выбары бюро сэкцыі. На сход павінны зьявіцца: 1) літ. драм. трупа Белтраму, 2) аўтраму, 3) літ. драм. група сіняй блузы друкароў, 4) мэталістаў, 5) будаўнікоў, 6) харчавікоў і ўсе пачынаючыя драм. пісьменьнікі рабочых драмгурткоў.

— **БДУ.** У 19 гадз., у акт. залі, гал. корп.—сход студ. і навук. прадаўнікоў фак. Наргасу і Саўбуду па перавыбарах гарсавету. Яўка абавязкова.

— 9-га лютага, у 6 з пал. гадз. веч., у памяць ін-ту аховы працы пры НКП БССР (вул. Карла Маркса і Энгельса № 44-23) адбудзецца чарговае пасяджэньне савету ІАП пры НКП БССР. Парадак дня: плян працы ІАП на 1931 г. Запрашаюцца члены савету, ЦП саюзаў, актыў сац. бытавых сэктараў фабзаўмясцкомаў, прадстаўнікі ін-ту сан. рэканструкцыі с. г., ін-т прамысловасьці, ін-т гігіены і санітарыі, і-т сац. гігіены, гарадраў, гар. інспэкцыі працы, гаспадарчыя аб'яднаньні і ўсе іншыя зацікаўленыя арганізацыі.

— **11 лютага** адбудзецца агульны сход утрыманцаў рабочых шэйнай фабрыкі «Кастрычнік» 2 і 4 груп, у чырвоным кутку ф-кі (Ленінская № 17) у 6 гадз. вечара. Паграда дня—выбары у гарсавет. Просьба да ўсіх утрыманцаў наведаць сходы.

— Да ведама ўсіх хатніх работніц мясцкому № 2. У нядзелю, 8 лютага, у клюбе камунальнікаў адбудзецца агульны сход хатніх работніц. Усе наймальнікі павінны на гэты сход адпусьціць сваіх работніц па перавыбары ў гарсавет.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і канцылярыя канторы Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-90	Начны рэдактар	6-19
Сакратар	10-71	Галоўная кантора	7-11
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-31

Умовы падпіскі (з дарвоным дадаткам „Праз'ўр")

На 1 мес.	— 1 р
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок нонп. пасьля тэксту — 3.1 к., пасьля тэксту — 1 р. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Кантэмпэратны рахунак выдавецтва № 52|10330 у Дзяржбанку.

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва «ЗЬВЯЗДА» Менск, Савецкая 63, 2-га паверх, тэл. 7-11.

Суботе, 7 лютага піказ для пошты. Пачатак у 8 г.

Бел рускі другі дзяржаўны тэатр В. Кіршон.

РЭЙКІ ГУДУЦЬ

Пьеса ў 5 дзеях. 9 абразоў.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Новы мастацкі фільм вытворчасьці „Саюзкіно"

АМЗРЫКАНКА кіно-эпапэя ў 6 частках

Часопіс „Саюзкіно" № 75

Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"

ВЯЛІКАЕ КАНЦЭРТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ

арт. Маск. Мюзік-Холла. М. І. Дарская, Эміль Кемпэр. 2 Жэрэ 2—зусім новы рэпэртуар

новы фільм сэзону ІГДЗНБУ

Пач. сэансаў у 7 г., 8 г. 40 м., 10 г. 20 м. Каса—з 5 гадз.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

Гастацкі фільм паводле раману Лідзіэм-Гейхэна

РУБІКОН драма ў 7 частках

Пачатак сэансу—6 гадз. Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"

МАБУЛ

(Крывавы патэл) драма ў 9 частках. Штодзённа 4 сэансы. Пачатак 1 с., 6 г. Каса адкрыта з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр"

Новы дзіцячы фільм вытворчасьці ВУФКУ

ГАЗЭТЧЫКІ

кіно-фільм у 6 частках. Пачатак сэансу у 1 гадз. дня. Каса адчынена з 12 гадз. дня.

КІНО „СПАРТАК"

2-гі тыдз. з 5 ЛЮТАГА

Бязьбіх

Барацьба гігантаў

драма ў 10 частках. Пачатак сэансу: 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г. Каса—з 5 годзін.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка"

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЯЛІКІ ГУКАВЫ ФІЛЬМ

13 ДЗЁН

СПРАВА „ПРАМПАРТЫ"

ЗДЫМКІ РАБІЛІСЯ ў дні судовага працэсу ў Маскве ў Калён.-залі Дому Саюзаў з 25-XI—7-XII—1930 г.

ЗЬМЕСТ ФІЛЬМУ:

1. Суд ідзе.
2. Показаньні падсудных.
3. Слова прамурору.
4. Апошнія словы падсудных.
5. Прыгавор.

Кіно-тэатр КУЛЬТУРА СКОРА!

Новы фільм вытворчасьці САЮЗКІНО (трэст Белдзяржкіно)

САПРАЎДНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Рэжысэры: А. ГАЎРОНСКІ і О. УЛІЦКАЯ

Аператары: Д. ШЛЮГЛЕЙТ і Н. СОКАЛАЎ

МЕНГАРКОМ КП(б)Б

склікае

11-II—31 г. у 12 гадз. дня у памяшканьні ГАРКОМУ КП(б)Б (3-ці паверх, вул. Энгельса, 28)

НАРАДУ

сакратароў вясковых ячэек прыгараднага раёну

з наступным парадкам дня:

1. Аб росьце партыі.
2. Аб рабоце з беднатой.
3. Мэтады і формы арганізацыі масавай работы па калектывізацыі.
4. Аб структуры парт'ячэек у вёсцы.
5. Аб мабілізацыі сродкаў.
6. Даклады з мест.

Яўка на нараду абавязкова і без спазьненьняў.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

МЕНСК. ГАРАДЗ. КІРАЎНІЦТВА КАДРАЎ

паведамляе, што ідзе

НАБОР на КУРСЫ КАМЕНАКЛАДЧЫКАЎ І ШТУКАТУРАЎ

Тэрмін вучобы—3 месяцы. Пасьля сканчэньня курсантыты застаюцца на працы ў прымацав. арганізацыі.

Курсанты забясьпечваюцца стыпендыяй і ім готовай абутак. а прыехаўшыя з раёну і інтэрнатам.

На курсы прымаюцца чорнарабочыя, батракі, сялянае адзіныя, калгасьнікі па ім кдаруючых калгасу. Узрост пасьпіхчых ад 18—30 год. На таварышы цэх будзе прынята 50 проц. жанчын.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі біржы працы да 15 лютага 1931 г.

ЛЕНЕЛЬСКАМУ ПАЛІТТРЭСТУ ПАТРЭБНЫ тэхнік-будаўнік і электрамонтэр

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

З прапановамі зварачацца па адрасе: Лепель, ПРАМКАМУНТРЭСТ.

ЗНОЙДЗЕН ГАДЗІНЬНІК

Згубішага просьба запісьці ў рэдакцыю «ЗЬВЯЗДА».

ПРЫБЛУДЗІЎСЯ сабака воўчай пароды.

Пасьля 5 дзён яму свайм. Адрас: Кайкаўсе с. с., Самахвалаўскага р-ну вёсці Сарафімаво. Гірпоўскаму Уладзіміру

МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНДУСТРЫЯЛЬНА ПЭДАГАГІЧНЫ ТЭХНІКУМ

(рэарганізаваны з Менскай аб'яднанай прафтэхшколы) з 3-гадовым курсам навучаньня. Рыхтуе тэхнікаў-інструктароў вытворчага навучаньня для ФЗС.

АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ 50 асоб.

На I курс па яўрэйскай сэкцыі на мэханічнае аддз. па апрацоўцы мэталю—9 ч., дрэва—9 ч.

На II курс па яўрэйскай сэкцыі па апрацоўцы дрэва—9 ч., мэталю—8 ч.

На II курс па беларускай сэкцыі па апрацоўцы мэталю—8 ч., дрэва—9 ч.

На I курс прымаюцца асобы, якія правучыліся на менш, чым паўгода ці скончылі I курс профшкол дрэваапрацоўчай і мэтлаапрацоўчай прамысловасьці (на базе сямігодкі).

На II курс прымаюцца асобы, скончыўшыя ФЗС і прафшколы мэтлаапрацоўчай і дрэваапрацоўчай прамысловасьці (на базе сямігодкі), ці якія правучыліся на менш чым паўгода на II курсе адзначаных прафтэхшкол.

Пры паступленьні трэба падаць дакументы, якія неабходны для паступленьня у тэхнікумы.

Стыпендыяй і агульным пэнсіянаньнем забясьпечваюцца згодна палажэньня аб індустрыяльных тэхнікумах.

ЗАЯВЫ ПРЫЙМАЮЦЦА ДА 15 ЛЮТАГА Г. Г.

г. Менск, вул. Валадарскага, д. № 5.

Дырэктар тэхнікуму ПАЎЛОВІЧ.

10-га лютага г. г. у 6 гадзін вечара склікаецца

пленум Цэнтральнага Камітэту Чырвонага Крыжу БССР

З ЗУДЗЕЛАМ РАЁННЫХ РАБОТНІКАЎ

Парадак дня:

1) Даклад выканкому саюзу т-ваў Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяца СССР аб бліжэйшых задачах чырвонакрыжных арганізацый.
2) Вынікі працы т-ва Чырвонага Крыжу БССР пасьля ліквідацыі округ.
3) Зацьвярджэньне цэнтральных лічбаў 5-цігадовага пляну т-ва Чырвонага Крыжу БССР.
4) Выканаць ніже бюджэту за 1929-30 г. і за асобны квартал і зацьвярджэньне кантрольных лічбаў на 1931 год.
5) Аб чарговым зьезьдзе т-ва Чырвонага Крыжу БССР.

ІНСТРУКЦЫЯ ДЛЯ ВЫДАЧЫ НАБОРНЫХ КАРТАК

працоўнаму насельніцтву гор. Менску.

1. Выдача наборных кніжак пачынаецца 7 II—20 II—30 г.

2. Выдача праводзіцца ў наступным парадку: працоўныя на прадпрыемствах, уваходзячых у сьпіс №№ 1, 2, атрымліваюць карткі на сваіх прадпрыемствах, а таксама члены сям'і—утрыманцы.

3. Усе іншыя працоўныя АТРЫМЛІВАЮЦЬ НАБОРНЫЯ КАРТКІ ў пунктах жактаў, раёнаў міліцыі і інтэрнатаў, буйных дамох, пасёлках і камгасных дамох.

4. На гораду (удзень адкрыты 24 пункты. У 4-х раёнах міліцыі па адным пункце ў кожным раёне, і па ўсіх Жактах. Грамадзяне, якія жывуць у Жактах, атрымліваюць карткі ў Жактах, у камгасных і прыватных дамох—у пунктах раёнаў міліцыі, у пасёлках, інтэрнатах і буйных дамох па месцы жыхарства.

5. Згодна пастановы СНК, адказваецць за правядзеньне працы па выдачы новых наборных картак укладаецца: у Жактах па старшыню Жакту, у буйных дамох—па старшыню дамкому, у пасёлках—па старшыню дамкому, у інтэрнатах—па заг. інтэрнату, адказваецць за выдачу новых наборных картак у раёнах міліцыі ўскладаецца на прадстаўніка праўленьня МЦРК, нач. нач. міліцыі па адм. частыі і на прадстаўніка ад гарадзкога савету. На працягу ўсёй працы ўсе вышэйпаказаныя вызваліцца ад працы.

6. У пунктах Жактаў і міліцыі працу пачаць з 12 II—31 г. і скончыць 20 II—31 г.

ПАЙШЧЫКАМ:

7. Пры атрыманьні новых наборных картак ПАТРЭБНА прадстаўляць НАСТУПНЫЯ ДАКУМАНТЫ:

1) замавую кнігу, 2) паявую, наборную і дзіячую кніжку, 3) членскі білет і разьліковую кніжку з афармленьнем за апошнія 3 м-цы зарплаты, даведку заўкому, мясцкому для ўставаўленьня колькасьці асоб, якія знаходзяцца на утрыманьні, а таксама вылучэньні рабочых прадстаўляюць даведку ад адміністрацыі з дакладным пералічэньнем працы, якая імі выконваецца і другі дакумант, разьлікавую кніжку і даведку аб вылучэньні. Дзеці павінны прадставіць матрыку аб нараджэньні ў 1919 годзе.

НЯПАЙШЧЫКАМ:

1. Для атрыманьня наборнай карткі—усе вышэйпералічаныя дакументы за выключэньнем паявой кніжкі і членскага білету саюзу.

2. Утрыманцы главы сям'і, якія знаходзяцца на-за Менскам, прадстаўляюць дакументы знаходжаньня на утрыманьні, даведку аб працы, якая выконваецца главою сям'і, а паказаньнем яго заработку.

3. Утрыманцы страхкасы і Сабеву—пэнсіянэры кніжкі, хатнія работніцы—працоўны загавор.

4. **Саматужнікі адзіночкі** —членскую кніжку таварыства саматужнікаў, патэнт на права працы.

5. **Пазбаўленыя права голасу,** якія маюць права на атрыманьне наборных кніжак,—даведку аб месцы працы, дзецям таксама матрыку аб нараджэньні ў 1919 годзе.

6. УТРЫМАНЦАМІ ЛІЧАЦЦА НАСТУПНЫЯ: жонка, матка, бацька, дзеці да 12 год, памаючыя самастойнага заработку і неатрымліваючыя дапамогі са страхкасы, а таксама непрацаздольныя.

7. Усе наборныя кніжкі і карткі, якія знаходзяцца на руках у пайшчыкаў, запраўдны на працягу 3-х месяцаў.

Нам. старшыні праўленьня МЦРК ТАРАСЕВІЧ.

Агіт.-масавы аддзел ЦК КП(б)Б

прапануе зьявіцца пакаянцам у пастанове Сакратарыяту ад 3-II 1931 г. таварышам

НА НАРАДУ 7 лютага г. г. роўна ў 2 гадз. дня, якая адбудзецца ў малой залі ЦК КП(б)Б (2-й паверх).

12-га лютага у 6 гадзін вечара у залі пасяджэньняў гаркому КП(б)Б (вул. Энгельса, 28) склікаецца

ПЛЕНУМ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б

з парадкам дня:

1) Аб падрыхтоўцы да весьвавой сяўбы і далейшых задачах у галіне калектывізацыі на прыгарадным раёне з даладкам аб падрыхтоўцы да весьвавой сяўбы на прыгарадных гасдварках МЦРК.

(дакл. т. т. АКСЮЧЫЦ і КУМКЕС).

2) Аб падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону 1931 году.

(дакл. тав. ГОЛЬДБЭРГ).

3) Вынікі партасьветы за I-е паўгодзьдзе.

(дакл. тав. ПЯТУШКОЎ).

Апрача членаў і кандыдатаў гаркому КПБ, рэвізакамісіі гаркому КП(б)Б, на пленум выклікаюцца:

на першым пытаньні сакратары вясковых парт'ячэек, старшыні сельсветаў, калгасаў і кіраўнікі саўгасаў (камуністы);

на другім пытаньні—сакратары парткалектываў і кіраўнікі будаўнічых арганізацый (камуністы);

на трэцім пытаньні—прапагандысты партыкол.

Гарком КП(б)